

ЧЫМ ЗДЗІЎЛЯЛА «БЕЛАГРА»? 3



ПАМЯЦЬ: КАНЦЛАГЕР КАЛДЫЧЭВА 4



8 ЧЭРВЕНЯ 2019 г. СУБОТА

№ 106 (28973)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА


# НАФТАВЫЯ РЭКІ, БЕНЗІНАВЫЯ БЕРАГІ

**Учора ў Наваполацку было горача — і гэта звязана не толькі з 29 градусамі цяпла, але і з візітам Аляксандра Лукашэнкі на ААТ «Нафтан». Што і казаць, тэму бруднай расійскай нафты на нашых НПЗ абмяркоўваюць усе — і вось кіраўнік дзяржавы асабіста адправіўся на прадпрыемства ў Наваполацк. Пра што гаварылі падчас візіту і да якіх рашэнняў прыйшлі — за ходам гарачай камандзіроўкі кіраўніка дзяржавы прасачыў наш карэспандэнт.**



Фота БелТА.

### Адзін падыход — без разначытанняў

Сацыяльна-эканамічнае становішча рэгіёна, Наваполацка і «Нафтана» — інфармацыю па трох гэтых тэмах далажылі кіраўніку дзяржавы па прыбыцці на прадпрыемства.

Пра першае расказаў губернатар Віцебскай вобласці Мікалай Шарснёў. Калі коратка, то сітуацыя стабільная, але паказчыкі маглі б быць вышэйшыя. І яны ў значнай ступені залежаць ад «Нафтана» — як толькі нешта не атрымліваецца ў прадпрыемства, падаюць і паказчыкі вобласці. Губернатар прызнаў, што такая залежнасць — гэта не зусім правільна, таму зараз ад яе сталі сыходзіць.

Па сітуацыі ў рэгіёне выказаўся і старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка. Паводле яго слоў, тут ёсць добрая структура прамысловасці, ёсць база — а вось сыравіны не хапае.

Выслухаўшы ўсё гэта, Прэзідэнт запатрабаваў ад кіраўніцтва рэгіёна выразна бачыць стратэгію рэгіянальнага развіцця.

«Павінна быць пэўная стратэгія, прыкладна як вы спрабуеце або спрабавалі (ужо, можа, адышлі) выбудаваць стратэгію ў сельскай гаспадарцы: калі вы ведаеце, дзе пабудаваць комплекс на цэлы раён ці на два, дзе нешта аб'яднаць, раз'яднаць, і ў выніку атрымаць эфект не толькі ў вытворчасці, але і ў эканоміцы», — падкрэсліў ён.

Паводле яго слоў, у краіне створаны ўмовы для развіцця малога і сярэдняга бізнесу. Зараз жа трэба думаць пра развіццё стратэгічных галін і прадпрыемстваў. У прыклад беларускі лідар прывёў мадэрнізацыю дрэваапрацоўкі — на яе ішлі неахвотна, але сёння ёсць вынік.

Пасля Прэзідэнту паказалі саму вытворчасць, устаноўку запаволенага каксавання нафтавых рэштак, якая цяпер будуецца.

### Не крычым, а па-дзелавому вырашаем

Падчас азнаямлення з метадамі кіравання тэхналагічнымі працэсамі прадпрыемства Аляксандр Лукашэнка ўзняў тэму кампенсацыі за брудную расійскую нафту. Яго пазіцыя такая: гэтыя пытанні трэба вырашаць выключна ў дзелавым ключы.

Нагадаем, забруджаная нафта дайшла да НПЗ у Мазыры. У той жа час на «Нафтане» паспелі зрэагаваць, тым не менш загрузка прадпрыемства была зніжана.

Беларускі лідар звярнуўся да гендырэктара «Нафтана» Аляксандра Дзямідава:

«Для цябе павінен быць максімальны эфект, няважна адкуль: ці ў вытворчасці, ці прадаў даражэй — за кошт маркетынгу, ці за кошт кампенсацыі шкоды».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Не трэба крычаць, наступаць, але свае інтарэсы трэба захоўваць. Яшчэ раз: поўзаць на каленях не трэба, трэба садзіцца і па-дзелавому вырашаць».

У СМІ з'явілася інфармацыя пра тое, што шэраг міжнародных кампаній прад'яўляе Расіі шкоду на суму да 800 мільёнаў долараў. Аднак Прэзідэнт звярнуў увагу, што больш за ўсё пацярпелі менавіта мы. Так што трэба ўважліва сачыць, як у выніку будуць размеркаваны сумы кампенсацыі.

Потым ён праехаў па вытворчай тэрыторыі прадпрыемства — фінальнай кропкай маршруту стаў будынак заводакіраўніцтва «Нафтана», дзе праз некалькі хвілін стартавала нарада.

### Па ўсіх аспектах — стапрацэнтная падтрымка

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што прайшло два гады з апошняй нарады, якая праводзілася на ўзроўні Прэзідэнта, дзе абмяркоўвалася сітуацыя з мадэрнізацыяй нашых нафтаперапрацоўчых заводаў і з нафтаперапрацоўкай у цэлым.

«Прытым гэтае пытанне — мадэрнізацыі НПЗ (як і дрэваапрацоўкі, іншых прадпрыемстваў, іх сотні, а можа ўжо тысячы, па якіх мы за перыяд суверэннай незалежнай Беларусі вялі размову) — гэта было ініцыявана вамі, спецыялістамі і кіраўнікамі нафтаперапрацоўчай галіны», — нагадаў ён.

СТАР. 2

# БАБІНАВІЦКІ «МЛЫНАР»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхар аграгарадка Бабінавічы Лёзненскага раёна Леанід МАКСАК, калі выйшаў на пенсію, заняўся ўпрыгожваннем сваёй сядзібы, збудаваў невялікі макет ветрака. Яшчэ адзін вятрак ён паставіў на тэрыторыі цэха дрэваапрацоўкі, у якім працаваў больш за дзесяць гадоў. За ўнёсак у справу добраўпарадкавання свайго населенага пункта сельскі Савет узнагародзіў яго дыпломам. На гэтым здымку Леанід Уладзіміравіч са сваёй жонкай Валянцінай Міхайлаўнай.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Таццяна ЛУГІНА, старшыня канцэрна «Беллегпрам»:**

*«Мы не баімся канкурэнцыі ў частцы сэканд-хэнду і азіяцкіх крам. Мы просім і будзем змагацца за тое, каб канкурэнцыя была сумленная, празрыстая, адкрытая. Каб тавары, прадстаўленыя ў гэтых сетках, адпавядалі патрабаванням і нормам заканадаўства Беларусі. Па нашых звестках, сёння ў структуры тавараў, прадстаўленых у гандлёвых залах магазінаў сэканд-хэнду, каля 70 % — новыя рэчы. Гэта значыць, пад маркай вырабаў сэканд-хэнда, якія не абкладаюцца ўвазнымі пошлінамі, завозіцца новае адзенне з этыкеткамі. Мы хочам мець сумленную канкурэнцыю. Калі жадаюць завозіць новую вопратку, няхай плацяць мытную пошліну, як і нашы вытворцы пры выхадзе ў еўразону. Каб сёння беларускаму вытворцу трапіць на рынак Еўрасаюза, трэба заплаціць пошліну мінімум 12 працэнтаў. Чаму ж новае адзенне з Еўропы ў нас павінна рэалізоўвацца пад маркай «сэканд-хэнд» і не абкладацца падаткамі?!»*

Прыёмная кампанія — 2019

# Балы ў абітурыентаў могуць вырасці

## Праз некалькі дзён у краіне стартуе цэнтралізаванае тэсціраванне

**Больш за 250 вопытных работнікаў Камітэта дзяржаўнага кантролю будуць задзейнічаны на ўсіх этапах прыёмнай кампаніі: ад правядзення ЦТ, унутрыўніверсітэцкіх іспытаў да падачы дакументаў і залічэння. Напярэдадні старту цэнтралізаванага тэсціравання ў сценах КДК адбылося пасяджэнне Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Яе асноўнай задачай з'яўляецца стварэнне для ўсіх абітурыентаў роўных магчымасцяў пры паступленні ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.**

Усяго сёлета на цэнтралізаванае тэсціраванне зарэгістраваліся 76 888 чалавек (на 7 % менш, чым летась). Гэта самы нізкі паказчык за апошнія шэсць гадоў. Калі параўноўваць з лічбамі 2014 года, то гаворка ідзе пра зніжэнне на 30 %. Амаль кожны другі абітурыент (47,3 %) будзе здаваць чатыры тэсты. Магчыма, хтосьці вырашыў скарыстацца леташнімі сертыфікатамі, але наўрад ці яны пасля ўвядзення новай сістэмы падліку балаў на ЦТ будуць канкурэнтаздольныя.

— Для правядзення ўступнай кампаніі ўсё падрыхтавана, яна павінна прайсці ў камфортных умовах, празрыста і справядліва, — падкрэсліў **старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных выпрабаванняў, намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** — Для здачы цэнтралізаванага тэсціравання на базе ўстаноў адукацыі адкрыты 40 пунктаў. Хачу звярнуць увагу, што з улікам тэмпературнага рэжыму неабходна паўсюдна забяспечыць доступ абітурыентаў да пітной вады, таксама ва ўсіх пунктах ЦТ павінен дзяжурыць медыцынскі работнік. І ніякага шуму, каб нішто не адцягвала ўвагу абітурыентаў. Прашу таксама добра прадумаць лагістыку перамяшчэнняў, каб на прапускных пунктах не ўтвараліся чэргі.

СТАР. 2



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# АРЭНДА ДАЧЫ: ЦІ ВЫГАДНАЯ СПРАВА?

**Надышло лета, а разам з ім — дачны сезон. Гэта значыць, што хутка ва ўсіх куточках краіны ўдзень будуць працаваць на зямлі, а ўвечары смажыць шашлыкі. Калі ў вас на гэты момант няма ўласнага лецішча і вы пакуль не збіраецеся яго купіць, але жадаеце апынуцца ў спякотныя летнія дні ў загараднай цішы, дом ці дачу можна арандаваць. «Звязда» паспрабавала разабрацца ва ўмовах здыму і высветліць, якія раёны сёння карыстаюцца ў беларусаў найбольшай папулярнасцю.**

Тэма арэнды хаты на сезон вельмі актуальная апошнім часам. Пастаянная дача патрабуе шмат часу, увагі і сіл. Да таго ж, гэта вельмі дорага (сярэдні кошт куплі складае каля 15 000$), таму купіць хату, а тым больш з усімі ўмовамі і ў добрым месцы, многія не могуць, а вось зняць на час — цалкам.

— *Перавагу куплі аддаюць людзі ў больш сталым узросце: ім хочацца стабільнасці,* — расказвае **заснавальнік агенцтва нерухомасці «Прэстыж» Андрэй ВАРЫНІЧЭНКА.** — *Найбольш папулярная арэнда дачы сярод маладых сем'яў, кампаній сяброў. Гэта зразумела, бо дача каштуе немалых грошай, у той момант як арэнда ў сярэднім складае 150$ за месяц.*

СТАР. 3

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Зяленскі: Кіеў выступае за спыненне агню, але армія будзе жорстка адказваць на абстрэлы

Прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі заявіў аб нязменнасці дыпламатычнай пазіцыі ўкраінскага боку па спыненні агню ў Данбасе і вяртанні затрыманых асоб. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні прэс-службы кіраўніка дзяржавы.

«Узброеныя сілы Украіны будуць адказваць жорстка і ў адпаведнасці з сітуацыяй. А на дыпламатычным узроўні наша пазіцыя аб неабходнасці спынення агню і вызвалення затрыманых застанецца цвёрдай і нязменнай», — адзначыў ён.

Такую заяву прэзідэнт зрабіў у сувязі з паведамленнямі ўкраінскага боку пра артабстрэл пазіцый украінскіх ваенных у ноч на 7 чэрвеня, у выніку якіх двое вайскоўцаў загінулі і восем атрымалі раненні. Са свайго боку, у Данецкай народнай рэспубліцы паведамілі, што ўкраінскія падраздзяленні мінулай ноччу абстралялі 122-міліметровымі снарадамі ваколіцы пасёлка Горлаўка.

### Мэй сыходзіць. Хто павядзе Вялікабрытанію да «брэксіту»?

7 чэрвеня Тэрэза Мэй сыходзіць з пасады лідара кансерватыўнай партыі, а неўзабаве пакіне і крэсла прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі. Ахвотных заняць месца каля штурвала краіны, якая села на мель «брэксіту», на здзіўленне, шмат.

Фаварытам у барацьбе за пасады кіраўніка партыі і ўрада і па апытаннях, і паводле ацэнак букмекераў з'яўляецца былы міністр замежных спраў Борыс Джонсан. Ён самы папулярны палітык і сярод членаў кансерватыўнай партыі, і сярод усіх брытанскіх выбаршчыкаў. Але гэта зусім не гарантуе Джонсану перамогі.

Кансерватарам зараз патрэбны лідар, які б хоць як-небудзь аб'яднаў парламенцкую фракцыю торы, што фактычна раскалолася па лініі стаўлення да «брэксіту». Большасць дэпутатаў можа вырашыць, што Джонсан, жорсткі «брэксіцёр» і да таго ж чалавек, схільны да гучных і не заўсёды прадуманых заяў, на гэтую ролю не падыходзіць, — і адсеяць яго яшчэ да фіналу.

У выніку першым прыйсці на фініш, выскачыўшы з-за спіны Джонсана, можа, напрыклад, міністр навакольнага асяроддзя Майкл Гоўв, які паставіў Джонсану падножку на папярэдніх выбарах лідара партыі, ці міністр замежных спраў Джэрэмі Хант, ці яшчэ якая-небудзь кампрамісная постаць.

Па стане на 7 чэрвеня балаціравацца мелі намер 11 палітыкаў-торы. Да пачатку выбараў іх колькасць можа скараціцца.

### Папа Францыск змяніў тэкст малітвы «Ойча наш»



Папа Рымскі Францыск унёс змены ў італьянскі пераклад тэксту малітвы «Ойча наш», паведамляюць італьянскія СМІ. Новая рэдакцыя абурыла многіх каталікоў.

Тэолагі і каталіцкія святары працавалі над зменамі тэксту больш за 16 гадоў, і новы варыянт быў зацверджаны Ватыканам 22 мая.

У новай рэдакцыі словы малітвы: «Не ўводзь нас у спакусу» будуць замененыя на «Не дай нам паддацца спакусе». Францыск казаў пра неабходнасць змяніць тэкст «Ойча наш» яшчэ ў 2017 годзе. Тады ён тлумачыў гэта тым, што цяперашні пераклад няправільна тлумачыць сэнс боскіх дзеянняў. «Бог не ўводзіць у спакусу, а дапамагае нам адразу ж падняцца пасля падзення. Гэта дрэнны пераклад, таму што тут гаворыцца пра Бога, які схіляе да спакусы. Але той, хто заахвочвае да спакусы, — гэта Сатана, гэта — роля Сатаны», — тлумачыў пантыфік.

Рэакцыя на дзеянні пантыфіка вельмі неадназначная. Частка каталіцкіх іерархаў падтрымала пазіцыю Францыска, аднак знайшліся і перакананыя праціўнікі такой трактоўкі.

Напрыклад, кіраўнік Паўднёвай баптысцкай семінарыі ў Луісвілі Альберт Молер у інтэрв'ю газеце Seattle Times назваў унесеныя змены «вельмі праблематычнымі». «Гэта малітва Госпада. Яна не з'яўляецца і ніколі не была асабістай малітвай папы, і ў Новым Запавеце мы маем словы самога Ісуса. І менавіта гэтыя словы папа прапануе змяніць», — адзначыў Молер.

ISSN 1990 - 763X

## «ЗЯЛЁНЫ» НАВАГРУДАК

**XV Рэспубліканскі экалагічны форум, які распачаўся ўчора, сабраў у Навагрудку больш за 10 000 гасцей. Прывітанне ўдзельнікам форуму ад беларускага лідара зачытаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Жаўняк.**

Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык, вітаючы гасцей форуму, адзначыў, што сёння вельмі важна абменьвацца вопытам, як найбольш эфектыўна супрацьстаяць рызыкам і выклікам экалагічнага характару, якія ўплываюць і на развіццё гарадоў: «Таму мы ўскладаем вялікія надзеі на сённяшні форум і спадзяёмся, што на яго пленарным пасяджэнні, трох секцыйных пляцоўках, падчас выстаўкі прагучыць шмат цікавых ідэй, канкрэтных практычных прапаноў, якія стануць добрай асновай для прыняцця рашэнняў па забеспячэнні далейшага ўстойлівага развіцця малых гарадоў і Рэспублікі Беларусь у цэлым».

**Вольга ПРАЛЮК.**

Я зноў выбіраю «Звязду»

# «ГАЗЕТА З ДУШОЙ...»

### Такой бачыць «Звязду» 90-гадовая Таццяна НІКАЛАЕВА з Гродзенскага раёна

**Таццяна Уладзіміраўна — былая настаўніца і амаль равесніца газеты. Не хапае якіх-небудзь дзясятка гадоў. «Звязда» нядаўна адсвяткавала 100-гадовы юбілей, а Таццяна Уладзіміраўна — 90-гадовы. З газетай «пазнаёмілася» яшчэ ў 70-я, калі працавала настаўніцай пачатковых класаў у вёсцы Путрышкі Гродзенскага раёна. Раз-пораз чытала «Звязду», якую выпісалі ў школу. Пасля выхаду на пенсію вырашыла выпісаць на дом. І не шкадуе. Чытае артыкулы пра выхаванне, сямейнае жыццё, культурныя падзеі. Гэтыя тэмы даюць станоўчы імпульс і пазітыўны настрой, што вельмі важна для самаадчування, лічыць Таццяна Нікалаева.**

Увогуле, жанчына і зараз захоўвае бадзёрасць духу, сустракаецца з настаўніцкім калектывам, ёй тэлефануюць і прыязджаюць павіншаваць са святамі яе былыя вучні. Так адбылося і падчас 90-годдзя, якое Таццяна Уладзіміраўна святкавала сёлета. У тым, што яна мае сілы і кожны дзень сустракае з добрым настроем, ёсць і заслуга «Звязды», кажа былая настаўніца. Яна жадае новых поспехаў свайму любімаму выданню, а мы, у сваю чаргу, спадзяёмся, што Таццяна Уладзіміраўна застанецца нашым чытачом яшчэ надоўга.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Спецыяльны рэпартаж

# ТЫДЗЕНЬ У СТЫЛІ «АГРА»

**Маштабная сельскагаспадарчая выстаўка завяршаецца заўтра ў Мінску. Карэспандэнт «Звязды» прайшлася па часовых павільёнах і ацаніла патэнцыял айчыннага АПК.**



## Ад зярнятка да суперкамбайнаў

Ад МКАДа да Шчомысліцы, дзе ўжо не першы год разгортваецца «Белагра-2019», рукой падаць. Сёлета на гэтым невялічкім адрэзку паміж мегаполісам і вёскай разгарнулася інавацыйная экспазіцыя «Эксперыментальнае поле». Хоць калі казаць больш дакладна, то з'явілася яно яшчэ ў верасні 2018-га — падчас сяўбы.

Так Навукова-практычны цэнтр па земляробстве НАН Беларусі прадставіў эксперыментальныя сарты азімай пшаніцы, жыта і ячменю. Усяго ў скарбонцы распрацовак беларускіх вучоных каля чатырох сотнень збожжавых, зернебабовых, крупяных, тэхнічных культур і шматгадовых траў. Яны займаюць каля 80% сельскагаспадарчых палёў краіны, а таксама 2,5 мільёна гектараў у найбліжэйшай суседкі — Расіі. «Эксперыментальнае поле» было створана, у першую чаргу, для гасцей выстаўкі, якія прыехалі здалёк і ў будучым могуць стаць новымі партнёрамі Беларусі. Супрацоўнікі Акадэміі навук вырашылі заваёўваць давер не словам, а справай: вось, глядзіце, рэальны вынік нашай працы.



Ход цікавы і ўражвае не толькі спецыялістаў, але і звычайных наведвальнікаў накшталт мяне. Пакуль ад прыпынку да ўваходу на выстаўку дойдзеш, дакладна настроішся на сельскагаспадарчы лад і парадуешся за добры ўраджай.

А дзе ёсць збожжа, там павінна быць і добрая тэхніка. На адкрытай пляцоўцы «Белагра» машынам па традыцыі цесна. Сотні ўзораў сельгастэхнікі быццам з'ехаліся пагрэцца пад чэрвеньскім сонейкам у чаканні ўборкі. Хочаш — лезь у кабіну гомельскага суперкамбайна «Палессе GS2124», хочаш — кіруй падмаскоўным прамысловым дронам для апрацоўкі палёў хімікатамі. Публіка з цікавасцю ўспрыняла навінку ад Мінскага аўтамабільнага завода — самазвал для перавозкі збожжа. Вялікі (даўжыня машыны амаль дзесяць метраў, вышыня — каля трох з паловай) і дужы (можа перавозіць да 19 тон і пры гэтым цягнуць прычэп).

## Чорнай ікры па-беларуску не жадаеце?

У спякоту так і хочацца нырнуць у шматлікія басейны, якія на выстаўку прывезлі рыбгасы з усёй краіны. Праўда, месца там ужо занятае. Фарэль, шчупакі, карпы... А між імі — дзіва! —вялізная рыбіна з доўгай «дзюбай», як у качкі.

— Гэта вісланос, — тлумачыць **намеснік дырэктара вопытнага рыбгаса «Сялец» Сяргей СТЭЛЬМАШУК,** заўважыўшы мае поўныя здзіўлення вочы. — Прывезлі восем гадоў таму па дзяржпраграме з Амерыкі. Выгадная прамысловая рыба: корміцца планктонам, хутка расце і дае чорную ікру. Аднак, каб атрымаць паўнавартаснае патомства, трэба чакаць 12 гадоў. А вось «беларускую» бялугу, якая таксама разводзіцца толькі ў рыбгасах, ужо можна пакаштаваць.

Насупраць воднага царства размясціўся жывёльны свет: коні, каровы, авечкі, козы.

— Зусім як я ў вечар пятніцы, — з усмешкай кажа мінчанка Аліна Іванец, тыкаючы пальчыкам на сонную свінню.

Дзяцей не адцягнуць ад двух дзясяткаў парсючкоў, якія, павіскваючы, топчуцца каля свінаматак. Гладзяць, чэшуць за вушкам і просяць бацькоў «завесці дома такую ж дзюдзю». Усё гэта нагадвае кантактны заапарк, толькі ў якім замест янотаў і шыншыл — тое, што яшчэ сто гадоў таму было амаль у кожнага паважаючага сябе беларуса. «Гарадскія!» — што тут яшчэ сказаць. Я, хоць і сама даўно жыву ў сталіцы, пытаюся ў жывёлаводаў: парсючкоў якой пароды лепш бацькам у вёску прыдбаць?

— А вось нашы — беларуская мясная, беларуская буйная белая і беларуская чорна-пярэстая. Выбар залежыць ад таго, хочацца вам больш сала ці мяса. Але ўсе тры — добры варыянт і для хатніх каўбас, і для катлет. Разводзім мы яшчэ і замежныя пароды — ландрасы, ёркшыры...

— Не-не, чужога неяк не хочацца, — перабіваю на паўслове Алену Яновіч з Навукова-практычнага цэнтра па жывёлагадоўлі НАН Беларусі і тлумачу: — Узялі мы неяк гэтых ландрасаў. Дык у іх жа шкура «дубовая»: ні пачысціць, ні з'есці і нават ад сала не аддзяліць. Дзякуй, але нам толькі сваё падавайце.

Разам з тым сельская гаспадарка — гэта не толькі пра ежу. Пакуль малыя забаўляюцца з парасяткамі і трусамі, а мужчыны прыцэньваюцца да рыбы, жанчын можна знайсці каля стэнда з норкамі. Такога звера жывым не пагладзіш, хоць ён і здаецца надзвычай мілым.

— Сёння норак у Беларусі разводзяць выключна на футра. У асартыменце — 11 колераў, — расказвае **дырэктар Маладзечанскай зверагаспадаркі Белкаапсаюза Таццяна АДАМІНА.** — Адна скурка нашай вытворчасці абыдзецца ў суму каля 45 рублёў (з улікам і НДВ і вырабу), жаночае футра сярэдняй даўжыні каштуе ў сярэднім 1600 рублёў.

У палатцы з курамі таксама шмат жанчын.

— Нясушкі і бройлеры ў мяне ёсць. Хачу што-небудзь прыгожае, — кажа маладая гаспадыня, якая прыехала на выстаўку спецыяльна па «экзотыку для вясковага куратніка».

Ёй тут жа прапаноўваюць прыгледзецца да пароды «Мільфлер», якую можна нават у доме трымаць замест папугая. Ганарлівыя і яркія — у суседзяў такіх дакладна не будзе!

Непадалёк на гасцей выстаўкі сумнымі вачыма пазіраюць авечкі, быццам просяцца дадому — на Віцебскае племпрадпрыемства.

— Знакамітая раманаўская парода. З'явілася ў Яраслаўлі яшчэ пры Пятры I — на ежу і вопратку. Раней жа як было: летам мужыкі выходзяць касіць, а ім трэба з сабой мяса ці сала даць на абед. Халадзільнікаў няма. Таму і трымалі авечак. Адну заб'еш — сям'я на тыдзень-другі ежай забяспечана, можна яшчэ і футра з аўчыны зрабіць, — робіць гістарычны экскурс **начальнік племаддзела Віцебскага племпрадпрыемства Канстанцін ВАРАБ'ЁЎ.** — Цяпер у Беларусі для гэтай жывёлы становішча сапраўды не самае завіднае. Не так проста збыць воўну. Якасная і цёплая, а попыту няма. Хоць бяры і выкідвай. Тое ж самае датычыцца і скур, якія выкарыстоўваюцца ў вытворчасці абутку.

Айчынная авечая скурка каштуе ўсяго каля трох рублёў, у той час як кітайскія — каля васьмі. Тым не меней адзін з найбуйнейшых вытворцаў скуранога абутку краіны працуе менавіта з усходнімі пастаўшчыкамі, грэбуючы беларускім прадуктам.

— З іншага боку, прыватнікі — у хатнюю гаспадарку ці для невялічкіх фермаў — авечак і баранчыкаў набываюць. Нават тут, на выстаўцы, ахвотна робяць замовы. З кожным годам цікавасць да жывёлы пакрысе вяртаецца.



## Як усё пачыналася

Першая Усебеларуская выстаўка сельскай гаспадаркі і прамысловасці адкрылася ў сталіцы 10 жніўня 1930 года і працягвалася аж да лістапада!

75 гектараў, 35 павільёнаў і сотні тысяч наведвальнікаў. Гэта было мерапрыемства нават не рэспубліканскага, а ўсесаюзнага маштабу, бо ВДНГ у Маскве з'явілася толькі праз дзевяць гадоў.

За месяц да выстаўкі «Звязда» пісала пра тое, што «нягледзячы на прароцтвы розных ныцікаў і малавераў, выстаўка адкрыецца ў вызначаны тэрмін». Паколькі «тэрмінова абсталёўваецца павільён маслазавода і заліваецца фундамент пад сіласную вежу», а «ў пададдзел паляўніцтва дастаўлены мядзведзь, воўк, лісы, арлы, філіны, выдра і інш.» Ці нават такое: «камплект абсталявання для механічнай падачы кармоў і вывазкі гною з павільёнаў жывёлагадоўлі заказаны ў Амерыцы і знаходзіцца зараз у дарозе». Газета сведчыла, што спецыяльна да выстаўкі прадоўжылі трамвайную лінію.

Па сутнасці дзеля мерапрыемства ў 1930-м з'явіўся «новы культурны асяродак горада Мінска з грандыёзным будаўніцтвам, пачынаючы ад будынкаў клінікі і да самай выстаўкі». Сапраўды былі ўзведзеныя дзясяткі драўляных і каменных павільёнаў, выставачных зал, сталовых і г. д. На выстаўцы працавала 15 аддзелаў: 10 сельскагаспадарчых і 5 — прамысловага сектара (гэта прытым, што да 1939-га палова краіны знаходзілася ў складзе Польшчы). Цікава, што менавіта тут у павільёне «Дзяржбуда» наведвальнікі маглі ўбачыць, як будзе выглядаць будучы Дом урада (яго ўвялі ў эксплуатацыю ў 1934 годзе). А лозунг выстаўкі: «Мінімум штучнасці і максімум натуральнасці» сведчыць, што нават у час «без пестыцыдаў і нітратаў» стаяла пытанне якасці аграпрадукцыі.

Сучасным арганізатарам «Белагра», безумоўна, ёсць чаму павучыцца ў сваіх папярэднікаў. Так, у 1930-м на выстаўцы працавала тры сотні «тлумачоў» — студэнтаў сельскагаспадарчай акадэміі, ветінстытута і розных сталічных універсітэтаў, якія вадзілі бясплатныя экскурсіі. Гэтага дужа не хапае і ў наш час. Звычайнаму наведвальніку, які, умоўна кажучы, зайшоў на выстаўку з вуліцы, надзвычай цяжка разабрацца, што там і дзе. Бо змяшаліся ў кучу «коні, людзі і трактары», а растлумачыць, дзе і што, няма каму.

**Ганна КУРАК. Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*Мінск — Шчомысліца — Мінск.*

# АРЭНДА ДАЧЫ: ЦІ ВЫГАДНАЯ СПРАВА?

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Канешне, гаворка ідзе пра больш-менш добраўпарадкаваныя дачы з тыпавымі ўмовамі і зручным месцазнаходжаннем. Як, напрыклад, дом у Ждановічах, які знаходзіцца побач з лесам. Ён здаецца на лета па цане 315 рублёў у месяц з перадаплатай у 50 працэнтаў. На ўчастку ёсць лазня, альтанка, месца для шашлыкоў. Дом абсталяваны мэбляй, ёсць халадзільнік.

Можна знайсці дачы і па больш нізкіх цэнах, але з зусім іншымі ўмовамі. Напрыклад, у Пухавіцкім напрамку здаецца дамок у 28 «квадратаў» усяго за 50$ у месяц + аплата электраэнергіі, і належнае ўтрыманне дома і тэрыторыі (касіць траву, парадак, уборка смецця і іншае на ўчастку плошчай 4 соткі). З парнікам, але без лазні і мэблі. Затое ўладальнік прапаноўвае магчымасць выкупу за невялікую суму (усяго 2500$). А вось у Жодзіне можна знайсці хату ўсяго толькі на 50$ даражэйшую, але абсталяваную і з лазняй, што, безумоўна, асабліва прываблівае арандатараў.



Ёсць варыянты і больш дарагія. У Ратамцы здаюць дачу за 225$ з выдатнымі ўмовамі для жыцця: лазняй, альтанкай, пляцоўкай для барбекю і роварамі. Ці, напрыклад, у раёне Раўбіч прапаноўваецца хата коштам каля 400$ у месяц, але добраўпарадкаваная і нават з тэлевізарам.

А вось прапановы з нашых, можна сказаць, курортных мясцін. Вёска Вусце Браслаўскага раёна. Тут здаецца на лета невялічкая двухузроўневая дача. «Лес побач, вадаём побач, возера побач, рака побач, маляўнічае месца, лазня, ландшафтны дызайн, еўра-аздабленне, аздабленне дрэвам, у вясковым стылі, месца для шашлыкоў, мэбля, тэлевізар, халадзільнік». Санвузел на вуліцы, праўда. Цана пытання — 32 рублі ў месяц.



На Браслаўшчыне, як і на Мядзельшчыне, дарэчы найбольш папулярны варыянт здачы жылля — пасутачны. Два-тры дні адпачынку з сям'ёй ці з сябрамі абыдуцца ў 20—150 рублёў за суткі. Вось, напрыклад, дом «у ціхім, утульным, маляўнічым месцы, на беразе возера Бярэжжа, за 2 км ад Браслава. Да 12 спальных месцаў. На ўчастку размешчаны: дом, лазня, домік для інвентару, альтанка, арэлі, батут для дзяцей. У доме ёсць водаправод, душ, гарачая і халодная вада. Туалет абсталяваны на вуліцы. Дом з лазняй злучаны вялікай тэрасай. Месца ідэальна падыходзіць для ціхага сямейнага адпачынку, з трох бакоў акружана лесам, на ўчастку ёсць сажалка, ручаёк, які агінае астравок, дзе стаіць альтанка, ёсць калодзеж з чыстай крынічнай вадой, абсталявана месца для вогнішча, мангал. Першая берагавая лінія дазваляе спакойна і нязмушана пасля лазні астудзіцца ў возеры або пачаць і скончыць гарачы летні дзень воднымі працэдурамі, бо выхад да возера за 50 метраў ад дома. У наяўнасці тры ровары і лодка за асобную плату...» За ўсё гэта гаспадары просяць па 100 рублёў у суткі.

— *Цэніцца ў нас вельмі Лагойскі напрамак, бо лічыцца самым зялёным у Беларусі,* — падкрэслівае Андрэй Варынічэнка. — *Таксама часта выбіраюць дачы ў Брэсцкім раёне і ў ваколіцах Гродна.*

І сапраўды, менавіта ў Лагойскім раёне здаецца вялікая колькасць дач. Кошт, у асноўным, залежыць больш ад якасці жытла, чым ад яго месцазнаходжання ці нават аддаленасці ад мегаполіса.

Карацей, як вы зразумелі, зняць часовае жыллё на прыродзе на пару месяцаў, справа не такая простая, як здаецца на першы погляд. Больш за тое, невялічкая недагледжаная дробязь можа сапсаваць і настрой, і адпачынак на некалькі месяцаў наперад. Таму:

## ПАРАДЫ БЫВАЛЫХ

Найперш выберыце сабе **напрамак.** Калі вам трэба будзе часта ездзіць у Мінск ці любы іншы горад, дзе вы працуеце (на работу або па справах), шукайце адпаведныя зручныя напрамкі. Нават калі вы збіраецеся ездзіць на дачу на машыне, не забывайце пра чыгунку. Па-першае, на электрычцы няма затораў, па-другое, у вас жа ёсць бабулі і госці без машыны, якія захочуць калі-небудзь наведаць вас.

Вызначце максімальную адлегласць ад свайго горада. Як далёка вы згодныя ездзіць? Ад гэтага будзе залежаць кошт дачы — чым далей, скажам, ад Мінска, тым танней. Але занадта далёка — таксама не варыянт, асабліва калі вы працуеце. Ацаніце сваю сітуацыю рэальна. Падумайце, наколькі загружаны патрэбны вам напрамак. Прыкіньце, колькі часу вы гатовыя марнаваць на дарогу. Не падманвайце сябе — 120 км ад Мінска, з Малінаўкі, па Брэсцкай, напрыклад, трасе — як часта вы будзеце ездзіць на гэтую дачу?

Часта гаспадары прапануюць у арэнду не ўвесь дом, а толькі частку. Напрыклад, першы паверх здаюць, а на другім жывуць самі. Ці яны пабудавалі на ўчастку другі дом — у адным жывуць, а іншы для дачнікаў. Такія варыянты каштуюць значна танней, чым пражыванне без гаспадароў. Але зразумела, што выйсці з раніцы на ганак, каб спакойна, атрымліваючы асалоду ад цішыні і адзіноты, выпіць кавы, таксама не атрымаецца.

Калі вы знайшлі выдатную дачу, у выдатным месцы, але для вас гэта занадта дорага, можна паспрабаваць зняць напалову з сям'ёй сяброў. Ідэальны варыянт. Хоць бываюць і нюансы. Наяўнасць дадатковых пунктаў можа моцна ўскладніць сумеснае пражыванне — сабакі, кошкі, бабулі, старэйшыя дзеці і гэтак далей. На ката можа быць алергія, старэйшыя дзеці не пасябруюць, бабуля будзе ўвесь час глядзець «Давай пажэнімся», ды яшчэ стануць лезці да вас з парадамі. Ну ці калі вас шасцёра, а іншая сям'я ўтраіх, уключаючы дзіця — наўрад ці будзе справядліва плаціць напалову. Увогуле, трэба сто разоў падумаць, перш чым рашыцца на гэты варыянт. Былі выпадкі, калі сябры пасля такой вось сумеснай арэнды переставалі быць сябрамі.

Заўсёды майце на ўвазе некалькі варыянтаў. Нават калі вы знайшлі тое, што шукалі, працягвайце актыўныя пошукі. Прынамсі, да поўнага завяршэння справы — калі дагавор падпісаны, грошы выплачаны, а ключы атрыманы. Памятайце, што ў гаспадароў няма мэты здаць лецішча менавіта вам. Часта здзелкі зрываюцца проста перад фіналам з самых розных прычын — з'явіўся хтосьці, хто прыехаў раней, заплаціў больш або проста чыста па-чалавечы спадабаўся больш за вас.

Таму памятайце, што дамоўленасць на словах гаспадара нічым не звязвае. Вы, напрыклад, дамовіліся стэлефанавацца ў маі і спакойна чакаеце гэтай даты. А ў патрэбны час званка ўсё няма, і гаспадар не бярэ трубку. Пакуль вы чакалі, прайшоў месяц, і гэты, і многія іншыя добрыя варыянты ўжо сышлі.

Таму, знайшоўшы варыянт, які задавальняе вас на першы погляд, імкніцеся даведацца аб ім загадзя максімум патрэбнага. Так вы моцна сэканоміце свой час і адкінеце непатрэбныя варыянты ўжо на этапе тэлефанавання. Не трэба саромецца, задавайце канкрэтныя пытанні і дабівайцеся ясных і дакладных адказаў. Часам гаспадары даюць неканкрэтныя адказы, як бы ўхіляюцца ад нейкіх момантаў — значыць, неабходна высветліць усё да канца. На што трэба асабліва звярнуць увагу.

**Дом —** высвятляючы падрабязнасці пра дом, не забудзьцеся спытаць аб тым, колькі ў ім пакояў, спальных месцаў, ці ёсць туалет і душавая, якая бытавая тэхніка стаіць, не забудзьцеся пра электрычнасць, газ, ваду. А таксама, ці збіраюцца гаспадары на гэты час вывезці куды-небудзь сточаныя шашалем прабабуліны рэчы, якія да таго знайшлі сваё месца на гэтай самай дачы?

**Участак —** абавязкова даведайцеся, што там расце, ці можна гэтым карыстацца і ці ёсць на ўчастку іншыя дамы або пабудовы. Ці трэба палоць агарод, абкошваць траву і г. д. Можа, увесь участак пакрыты газоннай травой, якую трэба падкошваць кожны тыдзень. Хто гэтым будзе займацца?

**Гаспадары —** удакладніце, ці ўласнікі яны гэтай канкрэтнай дачы і ці будзе на гэтай тэрыторыі пражываць нехта яшчэ. Так, дарэчы, даведайцеся між іншым пра наяўнасць хатніх жывёл — катоў, сабак, трусоў. Даведайцеся, ці здавалася гэтая дача раней і дзе самі гаспадары будуць адпачываць у гэтыя месяцы.

І нарэшце — **не цягніце час.** Добрыя дачы ляцяць хутка! Не адкладайце сустрэчу, згаджайцеся на месца і час, прапанаванае гаспадарамі. Дапусцім, ім зручна сустрэцца ў будні, а вы можаце толькі ў выхадныя. Лепш усё-такі вазьміце адгул і едзьце ў панядзелак — у выхадны такіх, як вы, будзе яшчэ пяць сем'яў. Дарэчы, лепш адразу ўзяць з сабой нейкую колькасць грошай. Калі варыянт вельмі падабаецца, адразу пакідайце заклад. Памятайце, што за добрымі дачамі ў прыгожым месцы ідзе паляванне, а гаспадары асабіста вам нічым не абавязаныя.

**Асабістая сустрэча** пасля тэлефонных перамоў — якраз той момант, калі трэба чэсна расказаць пра сябе. Колькі чалавек будзе рэальна жыць на здымаемым лецішчы, ці ёсць у вас хатнія жывёлы (адна такса, два каты, сава і папугай у клетцы, напрыклад), любіце вы цішыню або шумныя вечарынкі і ўсё такое. Але без фанатызму. Калі вы аматар загараць галышом — то, у прынцыпе, якая гаспадыні да гэтага справа? Паважайце гаспадароў і будзьце з імі максімальна адкрытыя, тады вы зможаце чакаць да сябе такога ж стаўлення.

А калі адмовяць? Што ж, шукайце іншы варыянт.

**І нарэшце.** Дача, як вы ўжо зразумелі, — справа сур'ёзная. Па-першае, гэта чужая маёмасць, і каштуе яна дорага. Падумайце, ці захочаце вы несці адказнасць у выпадку пажару або рабавання? Таму, дагавор — гэта гарантыя ад непрыемных сюрпрызаў. Напрыклад, гаспадары могуць дазволіць вам карыстацца мангалам або хлеўчуком, лодкай ці роварам, а потым забудуць пра гэта і пачнуцца прэтэнзіі. Так што праверце дакументы на ўласнасць і пашпарт гаспадароў. Лепш зняць копію.

Абавязкова **складзіце дагавор.** Можна захапіць з сабой стандартны варыянт дамовы арэнды (у двух экзэмплярах!) і потым упісаць туды дадатковыя пункты.

Раім **не забыцца пра такія моманты:**

✓ вопіс дома і маёмасці; хто можа пражываць у доме на час арэнды;

✓ што вы можаце рабіць на ўчастку (саджаць кветкі, збіраць яблыкі і г. д.);

✓ хто рамантуе паломкі;

✓ хто адказвае ў выпадку якога-небудзь форс-мажору;

✓ у якіх выпадках можна перапыніць дзеянне дагавора;

✓ абавязкова складзіце графік прыезду гаспадароў! Гэта вельмі важны пункт. Часам абяцаныя «пару разоў за лета» ператвараюцца ў штотыднёвыя прыезды без папярэджання, каб апырскаць ружы, прапалоць бульбу, адрамантаваць гарышча, забраць нешта з рэчаў і гэтак далей.

Дамоўцеся аб тым, ці патрэбны заклад і якім чынам вы будзеце перадаваць грошы. Абавязкова складзіце распіску, адзначыўшы ў ёй суму, дату, адрас і пашпартныя даныя чалавека, які ўзяў у вас грошы.

Арэнда дачы — добры выбар для тых, хто не можа доўга сядзець на адным месцы. Таму рашайцеся — і на шашлыкі!

**Маргарыта ГАЙДАРЖЫ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

А не шкодзь!

## За цяжарную казулю — больш за 12 тысяч

**Паляванне на гэтую жывёлу ў краіне адкрылася 15 мая, але толькі на дарослых самцоў і селекцыйных жывёл. Незаконную здабычу цяжарнай самкі выявілі ў Бялыніцкім раёне.**

Рэйдавая група Віцебскай абласной і Аршанскай міжраённай інспекцый устанавіла, што самку казулі (разам з чатырма законна здабытымі самцамі) падстрэліў паляўнічы-расіянін, а егер, які праводзіў тур, «заплюшчыў вочы» на парушэнне і аформіў дакументы на пяцярых самцоў.

Казуля выношвала трох дзіцянят, якія неўзабаве павінны былі з'явіцца на свет. Гэта высветлілі, адкапаўшы рэшткі жывёлы. Нанесеная шкода прыродзе ацэнена ў 12 240 рублёў, удзельнікі палявання яе ўжо пакрылі. Тым не менш у адносінах да абодвух вінаватых заведзена крымінальная справа. Вядома, што егер тры гады таму таксама прыцягваўся да адказнасці за незаконнае паляванне, паведамілі ў Дзяржінспекцыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



Да 75-годдзя вызвалення 1944 2019

Кожны трэці *Сумесны праект «Звязды» і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны*

# ГОРКАЯ ПАМЯЦЬ ПАЭТА

## Знаёмства вязняў з лагерам пачыналася са збіцця

**«Я не маю сіл апісаць усе тыя жахі, здзекі, катаванні, якія мне давялося перанесці ў засценках СД. Як я выжыў, як перанёс усё — не магу растлумачыць», — згадваў беларускі паэт Сяргей Новік-Пяюн. 25 лістапада 1943 года ён быў арыштаваны па даносе правакатара за сувязь з партызанамі і падпольшчыкамі і праз некаторы час адпраўлены ў лагер смерці Калдычэва. Лагер дзейнічаў з сакавіка 1942 па чэрвень 1944 года, за гэты час тут загінула 22 тысячы чалавек.**

Калдычэўскі лагер смерці, які знаходзіўся за 18 кіламетраў ад Баранавіч, ахоўвала каля сотні байцоў Беларускага паліцэйскага батальёна аховы. На кіруючыя пасады былі прызначаны адны з самых жорсткіх выпускнікоў нямецкай афіцэрскай школы (здраднікаў навучалі ў Мінску).

— Большасць карнікаў лагера былі мясцовыя. Чаму ўзнікла такая сітуацыя? Баранавічы — тэрыторыя Заходняй Беларусі, тут перажылі некалькі змен уладаў. 1939 год — толькі адбылося аб'яднанне Беларусі, а ў хуткім часе — нямецкая акупацыя, — расказвае **навуковы супрацоўнік Баранавіцкага краязнаўчага музея Алена БЫЧКО.** — Тут былі нязгодныя з палітыкай савецкай улады, менавіта з такіх на гэтай тэрыторыі складваліся калабарацыянісцкія арганізацыі: дзейнічаў «Саюз беларускай моладзі» (многія з выхадцаў гэтай арганізацыі сталі катамі ў Калдычэўскім канцлагеры), «Беларуская цэнтральная рада», «Беларускі саюз узаемапомачы». Гэта не было масава. Большасць людзей разумелі, што сапраўды нясе ў сабе акупацыя. На тэрыторыі Баранавіцкай вобласці ўтварыўся моцны партызанскі рух — да 1944 года колькасць партызан дасягнула 22 тысяч.

Алена Сцяпанаўна расказвае пра экспазіцыю, прысвечаную Калдычэўскаму лагеру, прыносіць з фондаў музея некалькі тоўстых папак з дакументамі, фатаграфіямі, успамінамі сведкаў...

### ПАЛІТЫКА ВЫНІШЧЭННЯ

Надзвычайная дзяржаўная камісія па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў правяла расследаванне фактаў злачынстваў, здзейсненых захопнікамі ў перыяд акупацыі тэрыторыі Баранавіч і іх ваколіц. Пры дапамозе матэрыялаў следства, агляду месцаў вынішчэння і пахавання, медыцынскіх даследаванняў трупаў і іх астанкаў, а таксама шматлікіх паказанняў сведкаў Камісія ўстанавіла, што, акупаваўшы 27 чэрвеня 1941 года Баранавічы, гітлераўскае кіраўніцтва і яго ўстановы — гестапа, СД, воінскія камендатуры — з першага дня не спынялі ў горадзе і яго ваколіцах рабаванні, здзекі, катаванні, угоны на катаржную працу ў Германію, павешанні, расстрэлы, масавае знішчэнне ні ў чым не вінаватых грамадзян, у тым ліку старых, жанчын і дзяцей. Усяго ў Баранавічах і іх ваколіцах нямецка-фашысцкія захопнікі за перыяд акупацыі знішчылі 128110 чалавек.

Акрамя лагера ў былым маёнтку Калдычэва і турмы ў Баранавічах, тут былі створаны гета, лагер для ваеннапалонных (88 тысяч забітых), дзейнічала сетка паліцэйскіх і гестапаўскіх засценкаў са сваімі камерамі катаванняў, дзе таксама адбываліся сістэматычныя забойствы, расстрэлы і павешанні. Вешаць акупанты стараліся ў кірмашныя і нядзельныя дні.



Вязні лагера з Калдычэва.

«У пачатку 1942 года Баранавіцкая турма была перапоўнена зняволенымі. Каты не паспявалі расчышчаць месцы для новых вязняў, якіх прыводзілі кожны дзень. Таму турму вырашылі вызваліць іншым шляхам: перакінуць зняволеных у Калдычэўскі лагер смерці, — згадваў жыхар Баранавіч Рыгор Алфераў, які трапіў у лагер у ліку першых вязняў. — Мы прыбылі першымі. Нас усіх па чарзе па-зверску збілі, не шкадуючы ні жанчын, ні дзяцей. Такі быў закон катаў: збіваць кожнага, хто трапіў у іх рукі. Потым кінулі ў брудныя стайні.

Сярод нас быў хлопчык. Ён хацеў уцячы з-за калючага дроту, але яго злавілі, выкапалі яму, прымусілі ўлезці ў яе, стаць на калені, і Сянкевіч раздрабіў яму галаву. А немец Ёрн (акрамя 99 беларусаў, у ахове лагера было чацвёра немцаў. Унтэр-афіцэр Ёрн быў шэфам-камендантам лагера. — **Рэд.**) выступіў з прамовай, у якой сказаў: «Так будзе з кожным, хто паспрабуе ўцячы з лагера». Гэта было ў першы дзень. А што тварылася потым, перадаць цяжка».

Іншыя сведкі таксама паказалі, што «знаёмства» з лагерам заўсёды пачыналася з моцных збіванняў — вязняў праганялі праз строй паліцаяў, якія білі людзей палкамі з жалезнымі наканечнікамі, дубінкамі, нагамі. Калі прывозілі новыя партыі вязняў, карнікі, каб «пазнаёміць» з парадкамі ў лагеры, адразу ж расстрэльвалі некалькі чалавек...

Катаваннямі і здзекамі карнікі займаліся без указанняў, па ўласнай ініцыятыве. Ахвяр маглі прымусіць легчы тварам уверх (і хадзіць па іх целах), качацца ў лужынах, каб прыбраць бруд пасля дажджу, лавіць пацукоў і здымаць з іх шкуркі (з якіх пасля рабіліся вырабы для камендата Ёрна і выплаўляўся тлушч, што выкарыстоўваўся для вырабу мыла). П'яныя паліцаі любілі забаўляцца — патрабавалі, каб вязні скакалі да знямогі «жабку» ці цешылі іх гульнёй у «кавалерыю» (калі адны зняволеныя — «коні», — садзяць сабе на плечы другіх — «кавалерыстаў»).

Пад будынкам упраўлення лагера была абсталявана камера катаванняў — зняволеным праколвалі іголкамі языкі, падвешвалі, расцягвалі мышцы і цкавалі на іх спецыяльна выдрэсіраваных сабак.

Вязняў ганялі на катаржныя работы — у шавецкі, сталярны, кравецкі, гарбарны, мылаварны цэхі. Для тых, хто працаваў на здабычы торфу, устанаўліваліся непасільныя нормы (мужчына павінен быў вынесці за дзень 1550 пліт торфу, жанчына — 1150), за невыкананне якіх збівалі. Пры гэтым людзі галадалі. Іх кармілі баландай — вадой, прыпраўленай тухлай мукой, часам палыном, крапівой і бацвіннем.

### «ПАЛЮБУЙЦЕСЯ — БЕЛАРУСКІ ПАЭТ!»

Сяргей Новік-Пяюн узгадваў свой першы допыт у Калдычэва, як немец здзекліва прадставіў яго каменданту аховы лагера Мікалаю Калько: «Палюбуйцеся, спадар лейтэнант, вось беларускі паэт». І адразу ж пачалося збіццё. Як згадваў паэт, у «прыёмным пакоі» на сцяне, як каўбаса ў мясным магазіне, віселі гумавыя дубінкі рознай велічыні.

Сюды на знішчэнне везлі мірных грамадзян. За тое, што родныя ваююць у Чырвонай Арміі ці ў партызанах. Па падазрэнні ў сувязі з партызанамі. За знаходжанне на вуліцы пасля васьмі гадзін вечара. Па даносе. Ды і без усялякіх прычын. У 43-м годзе было дастаўлена многа інтэлігенцыі — педагогаў, інжынераў, служачых, святароў. Вязні насілі нашыўкі, якія сведчылі пра ступень іх небяспекі для акупацыйнай улады. У першую чаргу падлягалі расстрэлу ахвяры, у якіх былі нашыты тры палоскі з кругам паверх іх.

«Калі ўспамінаю аб Калдычэве і аб тых цудоўных людзях, якія там пакутвалі і загінулі, жах ахоплівае мяне, — пісаў Новік-Пяюн. У Баранавіцкім краязнаўчым музеі захоўваюцца выразкі з газет з яго артыкуламі, якія аўтар сам даслаў у музей. — Некаторыя вязні паміралі з голаду, ад катаванняў, хвароб, іншых праз некаторы час расстрэльвалі групамі па 12, 20, 200 чалавек. Крэматорную печ узарвалі, бо «прапускная здольнасць» яе была малая і не задавальняла патрабаванні вылюдкаў...

Разарвалі дзіця — дзяўчынку напалам на вачах ашалелай ад жаху маці. Дубінкай па галоўцы ўдарыў Калько дзяўчынку-малютку, якая плакала на руках у маці, і гэткім чынам прымусіў дзіцятка змоўкнуць навекі. Адно маленькае дзіцятка эсдоўцы схапілі за ножкі і галоўку пабілі аб ствол бярозы. Доктара Лукашэню з горада Баранавічы і ягоную жонку, таксама ўрача, расстралялі»...

Згадаў паэт і пра 72-гадовую бабулю, якую кат паклікаў паглядзець, што «за сабака валяецца ў кустах», і старая знайшла там свайго разарванага на кавалкі сына. А на наступны дзень бабуля ўбачыла, як на насілках неслі труп яе мужа. Пісаў пісьменнік і аб прыгажуні, якую празвалі «цыганачкай» — спачатку ў яе закатавалі мужа, а пасля, калі вялі жанчыну на расправу, хацелі адабраць немаўля. Маці бараніла дзіця, і ў малой адарвалі ручку. «Ніколі не забуду, як бралі аднойчы жанчын, — пісаў Новік-Пяюн. — Іх было дваццаць. А з імі дзевятнаццаць дзяцей. Самаму старэйшаму хлопчыку было шэсць гадоў, самай малодшай дзяўчынцы — тры дні: гэта дзяўчынка нарадзілася ў лагеры... Калько і Прончак вырывалі з рук маці дзяцей і перадавалі ў рукі жанчын, якія дзяцей не мелі, каб тыя неслі іх. Яны, гэтыя вылюдкі, вырывалі з рук маці кансервавыя бляшанкі і лыжкі, з якіх яны кармілі дзяцей бурдой.

Прончак Юзаф, пасміхаючыся, казаў: «Яны вам больш не патрэбныя! На новай каменнай кватэры вам дадуць сярэбраны посуд». Дзяцей пасля кідалі ў машыну, як палены, і зверху трамбавалі нагамі жывы груз. Машыны паехалі ў бок лесу. Потым доўга над лесам стаяў чорны дым. Людзі казалі: трупы аблілі бензінам і падпалілі...

### ЯМА СМЕРЦІ

Ахвяры туліліся ў бараках на трох-чатырох-павярховых нарах. Новыя зняволеныя ўсё прыбывалі, і, каб вызваліць месца, людзей масава вывозілі на расстрэлы. Жанчын пры гэтым прымушалі распранацца дагала. 6 чэрвеня 1944 года партызанская газета «Чырвоная звязда» пісала пра знішчэнне ахвяр Калдычэва: «Кожныя два тыдні нямецкія забойцы ўчыняюць масавыя кары і расстрэлы. Рвы ў бярэзніку недалёка ад лагера напоўненыя трупамі нявінных людзей — нямыя сведкі нечуваных зладзеянняў немцаў. Нявінныя старыя, жанчыны і дзеці знішчаюцца па самых удасканаленых спосабах нямецкага людаедства. Раней каты заганялі ў рвы партыямі безабаронных людзей і затым расстрэльвалі з кулямётаў. Па некалькі гадзін дыхала зямля, якая прыкрывала паўжывых людзей. Некаторым раненым удалося выратавацца ад смерці. Тады двуногія звяры пачалі па-другому распраўляцца са сваімі ахвярамі. Асуджаных на смерць яны спачатку збіваюць да непрытомнасці, а затым расстрэльваюць».



Вязні насілі такія нашыўкі.

Пасля вызвалення гэтых зямель Чырвонай арміяй былі праведзены раскопкі на месцах масавага знішчэння. Недалёка ад лагера знойдзены суцэльныя месцы пахавання, у тым ліку ямы-магілы масавага пахавання.

У самім канцлагеры Калдычэва знойдзена яма-магіла ў форме літары Т памерам 35 на 5 метраў. Пры поўным ускрыцці ямы на глыбінях ад 0,5 да 3 метраў знойдзены трупы мужчын, жанчын і дзяцей, зваленыя ў беспарадку, але ўніз тварам з адведзенымі назад і звязанымі дротам рукамі.



Суд над здраднікамі.

Медыцынскім даследаваннем і эксгумацыяй 560 дарослых і 14 дзіцячых трупаў устаноўлена, што прычынай смерці дарослых былі кулявыя раненні галавы, а дзеці памерлі ад удушша, бо былі кінуты ў яму жывымі. Гэта апошнія ахвяры лагера, ад іх спехам пазбаўляліся ў канцы чэрвеня 1944. Сведкі згадвалі, як каты, усе акрываўленыя, бегалі з закасанымі рукавамі, і падводзілі да ямы, у якой ляжала многа трупаў, жанчын, старых, дзяцей — усё новых і новых ахвяр. З ямы даносіліся хрыпы, стогны, яма бурліла крывёй... Расстрэльвалі ў патыліцу, штурхаючы ў яму.

### РАСПЛАТА

У сакавіку 1962 года ў Баранавічах Ваенны трыбунал Беларускай ваеннай акругі правёў судовы працэс над чатырма карнікамі канцэнтрацыйнага лагера смерці, створанага ў вёсцы Калдычэва. На лаве падсудных знаходзіліся каты, якіх абвінавачвалі ў самых жудасных, агідных злачынствах: Мікалай Калько (камендант аховы лагера), Леанід Сянкевіч (яго намеснік), ахоўнікі Міхаіл Кухта і Андрэй Каралевіч. Пералічваліся жахлівыя факты: катаванні, здзекі, забойствы...

Так, былыя вязні лагера смерці расказвалі, як збівалі мужчыну, якога падазравалі ў сувязі з партызанамі, а пасля доўгіх катаванняў прыкалолі да падлогі фінскім нажом яго ступню. Сведкі памяталі замучаную маладую настаўніцу, якой на працягу трох гадзін асабіста Калько драбіў косці рук, рваў на галаве валасы, выпальваў гарачым жалезам мяса на плячах. Згадалі і пра 17-гадовага юнака, які спрабаваў вырвацца з лагера на волю, — Калько загадаў прывязаць няшчаснага да варот, прымусіў брахаць па-сабачы і не спыняючыся крычаць: «Я ўцякаў, мяне злавілі!», а калі юнак сціхаў, яго білі і прымушалі працягваць. Пасля хлопца павесілі, а ўсіх вязняў вывелі глядзець на пакаранне. Тых, хто адводзіў вочы, збівалі. Маладога доктара Лукашэню і 92-гадовага святара Валасовіча, якія не маглі глядзець на пакаранне, Калько прымусіў цалаваць ногі павешанаму. Наогул паказальныя расправы былі адной з устрашальных працэдур лагера. Вязняў прымушалі бегаць кругамі вакол забітых, заносіць трупы на некалькі дзён у свае баракі. Былы вязень Яфім Касцюк у судзе Ваеннага трыбунала згадваў, як камендант аховы сустракаў новых вязняў: «Без усялякіх прычын ён ударыў жонку па галаве і праламіў ёй чэрап. Яна ледзь выжыла, на ўсё жыццё засталася інвалідам». Яшчэ адзін сведка на судзе дэманстраваў старыя шрамы і расказваў, як падчас допытаў Калько зашчаміў адну яго руку дзвярыма, а з другога боку на яго нацкавалі двух аўчарак. Кісць рукі аказалася раздробленай, а цела пакрылася глыбокімі крывавымі ранамі...

Тады, у 1962 годзе, больш за паўсотні людзей выступілі сведкамі. На працягу шасці дзён тысячы людзей сачылі за працэсам, патрабавалі смяротнага пакарання... і іншага прысуду катам быць не магло.

Аблічбаваныя запісы з гэтага судовага працэсу захоўваюцца ў Баранавіцкім музеі.

Перад адступленнем карнікі спрабавалі замесці сляды — маскіравалі вялізныя магілы і рвы, раўнавалі з зямлёй, засявалі травамі, садзілі дрэвы і кусты. Але такое немагчыма схаваць. На месцы лагера смерці ў Калдычэве створаны мемарыяльны комплекс. Штогод сюды прыязджаюць людзі, нясуць кветкі...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Акцыя

# Палотнішча і альбом у гонар Перамогі

## У краіне з 11 чэрвеня да 3 ліпеня пройдзе маладзёжны марафон «75»

**Ён прысвечаны 75-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Марафон адбудзецца ў рамках рэспубліканскага патрыятычнага праекта «Кветкі Вялікай Перамогі». Правядзе яго Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі сумесна з Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі, Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пры падтрымцы Беларускай чыгункі і іншых зацікаўленых.**

Маршрут марафону пройдзе па месцах баявой славы. Сімвалічнымі акцэнтамі мерапрыемства стануць: правядзенне адкрытых дыялогаў «Беларусь памятае!», опэн-эйраў «Кветкі Вялікай Перамогі», стварэнне палотнішча «Беларусь памятае!», альбома «Беларусь памятае. Родныя твары Перамогі», функцыянаванне мабільнай экспазіцыі «Вызваленне Беларусі» і іншае.

Так, стварэнню палотнішча папярэднічае пошукава-даследчая работа. Актывісты Саюза моладзі ва ўсіх рэгіёнах краіны вывучаюць, абагульняюць неабходную інфармацыю пра Герояў Савецкага Саюза і поўных кавалераў ордэна Славы, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны — беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі.

Вывучыўшы і абагульніўшы біяграфіі герояў-землякоў, прадстаўнікі маладзёжнай арганізацыі ствараюць у колерах нацыянальнага сцяга Рэспублікі Беларусь рэгіянальныя палотнішчы «Беларусь памятае!», якія складаюцца з лапікаў тканіны чырвонага і зялёнага колераў з нанесенымі імёнамі Герояў Савецкага Саюза і поўных кавалераў ордэна Славы. Таксама на палотнішча наносіцца наступная інфармацыя: прозвішча, імя, імя па бацьку; гады жыцця, воінскае званне; населены пункт, у якім нарадзіўся.

Пры наведванні раёнаў і гарадоў створаныя рэгіянальныя палотнішчы будуць перададзены ўдзельнікам маладзёжнага марафона «75». Па яго выніку плануецца стварыць рэспубліканскае палотнішча «Беларусь памятае!». Яно будзе ўяўляць сабой чырвона-зялёнае палатно з надпісам «1941 Беларусь памятае 1945» памерам 6 на 12 метраў, складзенае з 478 кавалачкаў (239 чырвоных і 239 зялёных) з нанесенымі імёнамі Герояў Савецкага Саюза і поўных кавалераў ордэна Славы, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны — беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі.

Плануецца, што створанае палотнішча актывісты Саюза моладзі пранясуць 3 ліпеня ў Мінску ў патрыятычным шэсці «Беларусь памятае!». Затым яно будзе перададзена на захоўванне ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Маладзёжную ініцыятыву па стварэнні альбома «Беларусь памятае. Родныя твары Перамогі» падчас сёлетняга ўрачыстага мерапрыемства каля манумента Перамогі ў Мінску 9 мая падтрымаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, які даў юнакам і дзяўчатам своеасаблівае пажаданне, напісаўшы на вокладцы альбома слоган рэспубліканскай акцыі «Беларусь памятае!», якая заклікана захаваць святую памяць пра кожнага ўдзельніка вайны для нашчадкаў.

На старонках альбома будуць размешчаны фотаздымкі і кароткія біяграфіі воінаў-вызваліцеляў, нашых прадзедаў, дзядоў і бацькоў, якія абаранялі і вызвалялі краіну ад фашыстаў.

Таксама ў ім будуць фатаграфіі актывістаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, вядомых навукоўцаў, спартсменаў, дзеячаў культуры, прадстаўнікоў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў унутраных спраў, аддзелаў па надзвычайных сітуацыях, вядомых палітыкаў, журналістаў, творчай інтэлігенцыі, стыпендыятаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з партрэтамі іх дзядоў і прадзедаў з пакалення пераможцаў з усіх рэгіёнаў краіны.

Зрабіць свой унёсак у стварэнне альбома можа любы жыхар Беларусі. Для гэтага неабходна прадставіць фатаграфіі і кароткія гісторыі біяграфій сваякоў, якія бралі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне.

Інфармацыю можна адправіць на электронны адрас itbrsm@gmail.com (з пазнакай «Беларусь памятае!»).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Закрытое акционерное общество «ЮНИМИТ» (222220, Республика Беларусь, Минская обл., Смолевичский район, Плисский сельсовет, 9/12 в районе поселка Октябрьский) сообщает, что директором ЗАО «ЮНИМИТ» 03.06.2019 принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг. Формирование реестра акционеров осуществляется на 03.06.2019. УНП 690660279

**Извещение о повторном открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (ул. Николаева, ул. Гожская, ул. Мичурина, микрорайон «Барановичи-9») 9 июля 2019 года**

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-146* | микрорайон «Барановичи-9» | 0,0995 | 440100000003005965 | 61,25 | 13 365,79 | 2 600 |
| 2 | Земельный участок *, ** | ул. Николаева, в районе домовладения № 8 | 0,1124 | 440100000001010371 | 3 901,65 | 57 405,47 | 10 000 |
| 3 | Земельный участок * | ул. Гожская № 62 | 0,1119 | 440100000003006301 | 3 620,93 | 16 203,12 | 3 200 |
| 4 | Земельный участок* | ул. Мичурина, 41а | 0,1296 | 440100000002008775 | 3 411,41 | 49 563,68 | 9 800 |

* – Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельный участок имеет ограничения.

** – Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания блокированного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возмещение убытков землепользователю в размере 10 156,68 руб.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 9 июля 2019 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участий в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы.

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 с 10 июня по 4 июля 2019 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, а также градостроительный паспорт земельного участка (при наличии).

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 37, 72 00 10, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by

**Логойский сельский исполнительный комитет проводит 16 июля 2019 года открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации руб. | Задаток (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Знаменка, У-3 623284603001000208 | 0,1048 | газо-, водо- и электроснабжение | 7 000,00 | 1656,99 + реклама | 700,00 |
| 2 | д. Понизовье, ул. Руднянская, 1, 623284604601000148 | 0,1400 | электроснабжение | 3 500,00 | 1589,60 + реклама | 350,00 |
| 3 | д. Слаговище, У-4, 623284605301000042 | 0,1198 | - | 2 500,00 | 1317,02 + реклама | 250,00 |

Земельный участок в д. Понизовье, ул. Руднянская,1 имеет ограничения в использовании площадью 0,1400 га в связи с расположением в водоохранной зоне водного объекта, площадью 0,0112 га в связи с расположением в зоне линий электропередачи.

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на № BY25AKBB36006191011030000000 БИК AKBB BY 2X г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Аукцион состоится 16 июля 2019 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6. Последний день приема заявлений: 10 июля 2019 года до 17.00. Контактные телефоны: (801774) 28473, (8029) 177 95 11.

Жырандоля
Наш культурны асяродак
Выпуск № 20 (462)

У закрытай прасторы

# БЯСКОНЦА ПРЫГОЖА

## Аптымістычны Лесік на фестывалі «Арт-Мінск»

**29 мая ў Мінску адкрыўся ўжо другі Міжнародны фестываль мастацтва «Арт-Мінск». 16 пляцовак і 240 мастакоў мусяць ператварыць горад у адну вялікую галерэю, дзе да 30 чэрвеня пройдзе цэлая сетка выставак і мерапрыемстваў. Пра беспрэцэдэнтную падзею піша мастацкі крытык і галоўны рэдактар газеты «ЛіМ» Ларыса ЦІМОШЫК.**

«Мастацтва скончылася» — канстатуе работа творчай групы 605. Можна было б падумаць, сур'ёзная заяўка, нават ахнуць ад такой смеласці: у айчынным выяўленчым мастацтве здзейснілася рэвалюцыя... Толькі гэтую думку цягам мінулага стагоддзя ў розных варыянтах абыгралі мастакі розных краін, ды і нашы выказваліся на гэты конт. Аднак не ўсё так адназначна, калі гаворка пра беларускае мастацтва...

У кантэксце яго развіцця заява атрымліваецца сапраўды правакацыйнай. Таму што галоўная выставачная пляцоўка фестывалю «Арт-Мінск» імкнецца засведчыць якраз іншае: мастацтва — прыгожага і вытанчанага — у нас шмат. І мастакоў шмат: сёлета арганізатары атрымалі амаль 800 заявак на ўдзел. Ён адбываецца на 16 пляцоўках, галоўная з якіх — Палац мастацтваў, дзе ў вялікай экспазіцыі сабраныя прыкладна 220 аўтараў. У чэрвені, калі Мінск чакае ўдзельнікаў і гасцей Другіх еўрапейскіх гульняў, гэта ўжо больш чым сталічны мастацкі форум. Таму яго адкрыццё сёлета натхняў сам лісяня Лесік — талісман гульняў. Ярка-аранжавы мяккі персанаж, што разгульваў сярод публікі, вельмі спалучаўся з колерам камізэлькі прыбіральшчыка-перформера, які падчас адкрыцця дэманстратыўна змятаў у шуфлік умоўна бяссільнае мастацтва, у той час як творы беларускіх мастакоў ужо віселі на сценах. Яны размясціліся на двух паверхах — іх жа шмат! Дык у чым пытанне задзір пад нумарам 605?


Вольга МОКАТ, «Беларуская Афрыка».

Падобная правакацыя, першапачаткова здзейсненая «там, у іх», у свой час звяртала ўвагу на тое, што традыцыйныя жывапіс і графіка павінны былі пасунуцца і вызваліць месца для твораў, якія прапаноўвалі абсалютна іншы тып вобразнасці — праз думку, дзе вельмі важны кантэкст. І гэта было мастацтва не прыгажосці, а іншай сутнасці. А «тут, у нас» змены, якія прывялі да нараджэння новых мастацкіх формаў, яшчэ не ўсвядомленыя настолькі глыбока, каб улічваць іх у практыцы. У нас — асаблівы шлях. Нашы творцы служаць гармоніі: у традыцыйным пейзажы ці фігуратыўным мастацтве, абстракцыях, мастацкіх аб'ектах. Але ёсць творы ў змяшаных тэхніках, з пошукам форм, на стыку жанраў. І ўсё ж перавага алейнага жывапісу адчувальная. Дзеля большай пераканаўчасці жывапісцы паказваюць маштаб — праз дыпціхі ды трыпціхі. Чаго варты толькі партрэт біткоіна, памножаны на тры (Андрэй Смаляк паказаў лічбавую рэчаіснасць у разнаколерных гамах, і калі вы думалі, што гэта шэра і сумна, то памыліліся — гламурна-прыгожа). Але і наш навакольны свет — прыгожы. І чалавек у ім. Нават калі ён, як у Марты Шматавай, — у стане свабоднага падзення.

Мастакі ўмеюць маляваць — і паказваюць гэта з раскрытай душой, з гонарам. А што ж рабіць, калі ўмеюць? У гэтым — наша традыцыя, і яе можна пабачыць праз работы больш сталых творцаў, ці тых, каго ўжо няма, як Арлен Кашкурэвіч, ці ў работах тых, хто малады, але ўжо вядомы, як Алеся Скарабагатая, якую ўпадабаў наш глядач: такія рэалістычна-прыгожыя твары на яе работах, нібыта зайшлі на палатно вось толькі што...

Але замежнікі ў сваіх краінах маглі бачыць шмат чаго зусім не такога. Тут, канешне, мы існуём на кантрасце. Інсталяцый, канцэптуальных, актуальных і ультрасучасных формаў — адзінкі. Праўда, у параўнанні з мінулым годам усё ж прарыў: яно ёсць. Куратар карпарацыйнай калекцыі «Белгазпрамбанка» Аляксандр Зіменка не хаваў задавальнення: дынаміка арт-фестывалю навідавоку.

Трэба аддаць належнае адмыслова запрошанаму куратару Іллю Шыпілоўскіх, дырэктару расійскай арт-галерэі «Ельцын-Цэнтр». Перад ім была няпростая задача скласці экспазіцыю, праз якую чыталася б пытанне: што ёсць мастацтва? Што яно дае чалавеку (нездарма акцэнт зроблены на яго вобраз — прыгожы, складаны, у складаных умовах)? Пры тым што сёлета ёсць на выстаўцы работы мастакоў іншых краін (сёлета ўдзельнікамі сталі эстонская галерэя The SED ARTE Gallery і латвійская Museum EPAC / Museum of Exhibitions of Private Art Collections), але сваё пытанне куратар адрасуе Беларусі. Вялікі агляд сучаснай творчасці не можа быць проста канстатацыяй (праз экспазіцыю праглядае лінія лёсу айчыннага мастацтва — ад традыцый, якія ўкараніліся настолькі глыбока, а пышная крона гэтага вобразнага дрэва сапраўды дае палёгку ад гарачыні працоўных будняў), што недзе ўнізе іншыя парасткі марна змагаюцца за жыццё. Яны не факт, што прыжывуцца. А можа здарыцца і так, што перакрыюць вялікае дрэва, даўшы яркія плады, патрэбныя менавіта сёння. Мастацтва павінна прыцягваць да сябе ўвагу, адзначыў куратар.

Тыя, хто ўвайшоў у гісторыю, прыцягвалі ў свой час, які фіксавалі, а іх творы чапляюць і дагэтуль. Геніі, кажам пра іх. Наш зямляк і сучаснік Аляксандр Адамаў прапанаваў свой «Партрэт генія...» з думкай: у творчасці ўсё адносна. Адносна чалавека.

Кінакрокі

# Сястра Мусаліні, пыл Кабула і адвакат д'ябла

## Што добрага мы пабачылі на Кракаўскім кінафестывалі

**Тут факусуюцца на дакументальным і кароткаметражным кіно, глядзяць фільмы пад адкрытым небам каля Вавельскага замка і ўручаюць «Цмока цмокаў» за ўклад у развіццё сусветнага кінематографа — у нядзелю 2 чэрвеня завяршыўся Кракаўскі кінафестываль, да якога прычыніліся і мы, на якім беларускі рэжысёр узяў адну з узнагарод і які апынуўся ў цэнтры кінематаграфічнага скандалу.**



Кіно пад Вавелем.

### Што гэта такое

Восем фестывальных дзён, каля двухсот пяцідзесяці фільмаў з усяго свету, чатыры конкурсы, адзінаццаць пазаконкурсных праграм ды індустрыяльная платформа. «Калыска польскай дзяржавы» і культурная сталіца Польшчы на дні фестывалю, як тут кажуць, становіцца і цэнтрам польскай кінематаграфіі, якім у звычайны час з'яўляецца ўсё ж Варшава.

Кракаўскі кінафестываль прайшоў ужо 59-ы раз. Для параўнання: дакументальныя Каны IDFA ў Амстэрдаме ў лістападзе адбудуцца 32-і раз, у найстарэйшага кінафестывалю кароткаметражнага кіно ў Оберхаўзэне ў пачатку мая было 65-е выданне, а Мінскаму міжнароднаму кінафестывалю «Лістапад» 25 гадоў.

Не паспрачаешся, арганізатары рыхтуюць для кінааматараў бездань прапаноў (і гледачы гэта цэняць): дакументалістыку, ігравое кароткаметражнае кіно і анімацыю, карціны для дзяцей і моладзі, альтэрнатыўныя відэакліпы, навуковы док, студэнцкія фільмы, рэтраспектыву, нарэшце, секцыю музычнага кіно на вялізным экране каля падножжа Вавельскага замка.

Штогадовая ўзнагарода «Цмок цмокаў», якая ўручаецца на Кракаўскім кінафестывалі за ўклад у развіццё дакументальнага і анімацыйнага кіно (летась яе атрымаў Сяргей Лазніца), гэтым разам дасталася канадскай і амерыканскай аніматарцы Кэралайн Ліф (знайдзіце, напрыклад, яе кароткі фільм «Сава жэніцца з гускай: эскімоская легенда»).

Дарэчы, некаторыя склады журы маюць дадатковую адказнасць: пераможца Міжнароднага дакументальнага конкурсу (узнагарода называецца «Залаты рог») становіцца прэтэндэнтам на намінацыю на «Оскар», найлепшы Еўрапейскі кароткі метр можа падацца на адпаведную намінацыю European Film Awards, а для ўсіх пераможцаў кароткаметражнага конкурсу скарачаецца шлях падачы заяўкі на зноў жа «Оскар».

Сярод удзельнікаў сёлета аказаліся і беларускія аўтары: у Нацыянальны конкурс былі ўключаны карціна «Чыстае мастацтва» Максіма Шведа (тут адбылася яе прэм'ера) і ўжо вядомая нам Summa Андрэя Куцілы. Апошняя, раней узнагароджаная як «найлепшы дакументальны фільм сярэдняй працяглацсі» на IDFA, была адзначана і Кракавам: Андрэй Куціла атрымаў «Срэбнага Лайконіка» як рэжысёр найлепшай дакументальнай работы конкурсу.

Між тым 59-ы сезон не прайшоў без скандалу, але такога, здаецца, нязначнага: рэжысёр Конрад Шалайскі абвінавáціў кінафестываль у «прэвентыўнай самацэнзуры», бо той не ўключыў у праграму яго фільм «Добрая змена» пра «сучасную Польшчу, падзеленую палітычнай сцяной». Карціна не падышла найперш па фармальных крытэрыях, хоць і свой погляд на мастацкія якасці праграмеры не абавязаны тлумачыць, але скарга Шалайскага была агучана і петыцыя тых, хто падтрымлівае рэжысёра, створана. У абарону аўтаноміі фестывалю ў выніку выступіла Гільдыя польскіх рэжысёраў дакументальнага кіно, сябры якой (у тым ліку аўтарытэтныя дакументалісты) у сваёй заяве адзначылі, што з 1989 года на Кракаўскім кінафестывалі не сустракаліся з выпадкамі палітычнай цэнзуры альбо падзелу фільмаў на «слушныя» і «няслушныя». Здаецца, гнеўны выпад толькі падтакнуў станоўчай рэпутацыі форуму.

### У цэнтры ўвагі

Міжнародны дакументальны конкурс збірае «найбольш хвалюючыя і шакавальныя гісторыі, што датычацца актуальных сацыяльных і палітычных праблем па ўсім свеце». Толькі ў шаснаццаці карцінах — мігранты, экалогія, захворванне на рак, сённяшняе амерыканцаў — ветэранаў войнаў, канфлікт паміж ізраільцянамі і палесцінцамі, тэрарызм, рэчаіснасць Афганістана, зніклыя пасяленні абарыгенаў у Аўстраліі і на поўначы Аргенціны, што паказана разнастайнымі спосабамі, з іроніяй ці сентыментальнасцю, праз асоб, асабістыя драмы і драмы сям'і.

Нечакана — здаецца, для рэжысёра таксама — павярнулася гісторыя Давуда з Ірана, які захварэў на рак лёгкіх. Напачатку, калі бачыш, як галоўнага героя голяць альбо кансультуе ўрач, думаеш, што глядзіш чарговы банальны сюжэт пра перажыванне асабістай катастрофы (гучыць, канешне, па-каштунску, вядома ж, кожная чалавечая драма вартая фільма і не аднаго). **«Дом для цябе» Махдзі Бакшы Магадама** сапраўды ўтрымлівае ўсе натуральныя атрыбуты такога наратыву — несуцяшальны дыягназ, шпіталь, малітвы і так далей. Толькі не пра перажыванні пратаганіста гэта карціна знята: дакументальны фільм набывае вельмі далікатны рамантычны падтэкст, калі Давуд залазіць у пазыкі і адчайна намагаецца завяршыць будаўніцтва дома да сваёй


Кадр з фільма «Чацвёртае каралеўства».

смерці — дома, у якім змагла б жыць яго жонка. Так і атрымліваецца: галоўны герой памірае, а яго каханая застаецца адна — у пабудаваным адмыслова для яе доме, і фільм ужо не пра асабістую драму, а пра тое, чаму чалавек прысвячае свае апошнія адмераныя дні.

Бяздомныя сабакі індыйскай Калькуты забрахалі і завылі ў фільме **«Горад сабак» Джэсі Алк.** Крыху бязладная работа паказала поўныя жывёл вуліцы горада і людзей, якія займаюцца іх выратаваннем. Індыя — вядома ж, бясцэнная фактура, можна быццам нічога больш і не рабіць, але аўтар змог: ні колеры Калькуты, ні нават сабакі не аказаліся больш цікавымі, чым душы людзей, якія прысвячаюць сябе высокай місіі, а між тым выяўляюць «невысокія» элементы жыцця і мыслення.

Сюрпрызам сталі беларускія сляды ў канадскай карціне **«Памяць ёсць наша айчына» Джонатана Каладзея Дзюранда —** традыцыйным, глыбокім і небессtаронnім, даследаванні з інтэрв'ю, архівамі і закадравым голасам. Рэжысёр расказвае гісторыю сваёй бабулі, што разам з сям'ёй, як і тысячы іншых палякаў, падчас Другой сусветнай вайны была дэпартавана з роднага паселішча на тэрыторыі Беларусі ў Сібір — факт, недастаткова ўшанаваны нават польскай гістарыяграфіяй. Пасля сям'я знайшла сабе месца ва Усходняй Афрыцы і ў рэшце рэшт разышлася па свеце. Джонатан некалькі разоў прыязджаў у Беларусь у пошуках знакаў сваіх продкаў і знайшоў цагліну, назву мясцін ад прозвішча той сям'і ды ўспаміны мясцовых вяскоўцаў. Ён таксама быў у Афрыцы і выявіў, што людзі дагэтуль памятаюць польскія пасяленні і могуць расказаць, як напачатку баяліся новых суседзяў. Ён паразмаўляў з іншымі жанчынамі, што праз тую дэпартацыю былі вымушаны шукаць свой дом па ўсім свеце і ў рэшце рэшт задаў сваім бабулям (роднай і яе сястры) заканамернае пытанне: ці адчуваюць яны сябе пасля гэтых блуканняў полькамі. А яны адчуваюць, на польскай мове. Страсянула ад каментарыя рэжысёра ў бок прысвечанага *Вялікай Айчыннай вайне* надпісу недзе ў Беларусі. *Другая сусветная,* кажа, для беларусаў пачынаецца ў 1941-м, забыліся, што адбывалася два гады перад (а мы шмат пра што забыліся, хлопча, толькі не пра гэта).

Рэжысёр вельмі сімпатычнай ізраільскай карціны **«Сястра Мусаліні» Юна Сулейман** таксама расказвае пра сваю бабулю (Міжнародны конкурс уключыў адразу тры ізраільскія фільмы). Гэта любоўны аповед пра жанчыну-ўдаву, якая жыве адна, час ад часу прымае аднаго са сваіх сыноў, ганяе хатнюю работніцу, лаецца з рознымі службамі ды ганьбіць жыццё, маўляў, дрэнь гэта ўсё. Сціплы жыццяпіс — галоўная гераіня глядзіць тэлебачанне, гатуе вячэру, робіць прычоску ў свайго цырульніка, значна ўзбагачаецца яе маналогамі, размовамі па тэлефоне ды незадаволенымі каментарыямі. Батл пультамі ў бальнічнай палаце і кансультацыя з астролагам у фінале — сакрэт «Сястры Мусаліні» найперш у гераіні, але і ў шчырым, іранічным і нават камічным рэчышчы, у якім зроблены крыху незвычайны партрэт з рэтраспектыўнай перабіўкай у сярэдзіне.

Дзве паралельныя лініі з асобнымі героямі вядуцца ўжо ў «сур'ёзным» і даволі ўражальным фільме **«Кабул, горад на ветры» Абузара Аміні.** Шэры Афганістан становіцца наваколлем для двух не па гадах дарослых хлопчыкаў і кіроўцы аўтобуса Абаса. Апошні набывае аўтобус, каб падрамантаваць яго і зарабляць перавозкай пасажыраў. Рамонт расцягваецца надоўга і не заканчваецца нічым добрым: чарговая няўдача толькі нагадвае пра неспакой і турботы жыцця без аніводнай хвіліны, калі не трэба было б выкручвацца з цяжкасцяў. На другой лініі хлопчыкі вымушаны быць дарослымі, калі надоўга з'язджае іх бацька: адкрыццё Абаса прымушае спраектаваць яго жыццёвую формулу на будучыню дзяцей, якім, здаецца, таксама наканавана выжываць, але не жыць. І толькі ў канцы пыльны горад, поўны расчараванняў, знакаў смерці і няпэўнасці, загараецца фальшыва-прыгожымі агнямі.

### Неаднамернасць

У пэўны момант Кракаўскага кінафестывалю прыйшоў час рабіць выбар — наша журы Міжнароднай федэрацыі кінакрытыкаў (FIPRESCI) мела адзначыць узнагародай адзін фільм. **«Чацвёртае каралеўства» Алекса Лоры Сэркосы і Адана Аліягі,** здаецца, было па-за канкурэнцыяй — самае неаднамернае кінапалатно, заснаванае між тым на «прымітыўным» матэрыяле. Карціна паказвае арганізацыю, альбо суполку ці прытулак, у Нью-Ёрку, якая займаецца сартаваннем смецця і дае гэту работу сацыяльным ізгоям. Безліч пустых бутэлек запаўняюць ледзь не цэлы экран, а над імі сінее і яснее неба як сімвал найпрыгажэйшых мар герояў карціны. Экалогія, алкагалізм, сацыяльная няўладжанасць пераліваюцца метафарамі, філасофіяй і вельмі пранікнёнымі эпізодамі адзіноты, калі за сцяной горы смецця, а ў думках лепшае жыццё. Перад аб'ектывам аказаліся дзіўныя персанажы — гэта кардынальна іншы, незнаёмы, «далёкі» ад нас свет, пры гэтым моцна эмацыянальна зараджаны і складана вывернуты. Дакументальныя здымкі ператварыліся ў шматузроўневае канцэптуальнае выказванне, поўнае як пацешных, так і меланхалічных эпізодаў, дзе жаданні асобнага чалавека перакрываюцца вобразам сучаснага свету, дзе смецце здольнае хутка закрыць неба для кожнай з мар.

На «Оскар» па выніках фестывалю будзе прасоўвацца ізраільскі фільм **«Адвакатка» Рэйчал Лі Джонс і Філіпа Белайша,** які атрымаў ад журы галоўную ўзнагароду. Карціна прысвечана адвакату Леі Цэмел, якая бярэцца за самыя складаныя судовыя справы і абараняе тэрарыстаў. Неадназначная ў ізраільскім соцыуме персона, што атрымала мянушку «адвакат д'ябла», у фільме бярэцца за чарговую абарону, гэтым разам хлопчыка, прыцягнутага да тэрарыстычнага акта. Працэс яна прайграе, як, па яе прызнанні, усе такога роду працэсы, што выкрывае яе нязгасную настойлівасць і разуменне кожнай сваёй справы як усё ж такі неадназначнай. Карціна далікатна намякае, што падсудны здзейсніў тэракт у стане пэўнай несвядомасці, але размывае чорны і белы колеры светапогляду галоўным чынам праз стаўленне соцыуму да гераіні. Леа Цэмел як аб'ект усеагульнай нянавісці назірае ва ўсведамленні людзей змены, а фільм суправаджае ў надзвычай дыскусійную тэму, і не толькі для Ізраіля.

Дакументальная праграма — вядома ж, і з сучаснасцю ў парадку дня — лішні раз паказвае важнасць мінулага, якое ўплывае на сённяшні дзень, свядомасць чалавека і развіццё грамадства. Адкрыцці паказаных са спіны ветэранаў войн у Афганістане і Іраку **(«Стрэс» Фларыяна Барона),** правінцыйная культура і справаздачы па савецкіх лякалах у буднях **«Хору цеплатэхнікаў» Надзі Парфан** з Украіны, аповед пра наглядчыкаў варшаўскага заапарка, якія ў часы вайны выратоўвалі яўрэяў (**«Пра звяроў і людзей» Лукаша Чайкі —** дакументальны аналаг карціны «Жонка наглядчыка заапарка»), у шэрагу іншых фільмаў і культуры ў цэлым становяцца той самай неабходнай для прапрацоўкі наваколля рэфлексіяй. Дакументальнае кіно капае ўсё глыбей і размаіцей, і нават гэтага недастаткова.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

Запрашальнік

# ДА РАДЗІВІЛАЎ, ОПЕРУ ПАСЛУХАЦЬ

**Тэатральныя і музычныя фестывалі пад адкрытым небам — з'ява не новая. Напрыклад, Зальцбургскі фэст праходзіць у Аўстрыі, на радзіме Моцарта, яшчэ з 1877 года (на рэгулярнай аснове — з 1920-га), а Фларэнтыйскі музычны май збірае аматараў оперы і акадэмічнай музыкі з 1933 года. Наш беларускі опэн-эйр опернага і балетнага мастацтва — «Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў» — сціпла адлічвае толькі дзясятую гадавіну, але займеў ужо сваіх адданых прыхільнікаў і заўсёднікаў — паглядзець і паслухаць яго прыязджаюць не толькі з іншых гарадоў, але і з іншых краін.**

Сёлетні фестываль пройдзе ў старажытным Нясвіжы з 14 да 16 чэрвеня, як заўжды, на некалькіх пляцоўках: ва ўнутраным дворыку і тэатральнай зале рэзідэнцыі Радзівілаў і ў адным з найпрыгажэйшых у Еўропе барочным касцёле Божага Цела.

**14 чэрвеня** ў тэатральнай зале Нясвіжскага замка адбудзецца канцэрт «Партрэты. Клаўдзія Шульжэнка», на якім прагучаць галоўныя хіты вядомай савецкай спявачкі ў выкананні салісткі Вялікага тэатра Беларусі Алены Сала. У Фарным касцёле дасць канцэрт «Беларуская капэла», рэжысёрам і вядучым якога выступіць кіраўнік калектыву Віктар Скорабагатаў, а ў праграму ўвойдуць арганныя і вакальна-камерныя творы стваральніка нацыянальнай класічнай оперы Станіслава Манюшкі. (У свой час кампазітар амаль 20 гадоў працаваў арганістам у касцёле ў Вільні, таму напісаў даволі шмат твораў рэлігійнага кшталту.) А ўвечары Нясвіж будзе дыхаць паветрам Вероны і затаіўшы дыханне захапляцца шэкспіраўскімі страсцямі «Рамэа і Джульеты» — новую аўтарскую рэдакцыю знакамітага балета прадставіў у бягучым тэатральным сезоне народны артыст СССР і Беларусі, мастацкі кіраўнік Вялікага тэатра Валянцін Елізар'еў.

У другі фестывальны дзень, **15 чэрвеня,** жыхароў і гасцей Нясвіжа чакае ўражальная опера Джакама Пучыні «Тоска» ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра тэатра Міхаіла Панджавідзэ і яшчэ адзін канцэрт, дакладней нават канцэрт-спектакль, прысвечаны 200-годдзю Станіслава Манюшкі — у ім артысты і рэжысёр пастараюцца перадаць камерную, утульную атмасферу музычнага салона ў шляхецкай сядзібе.

**16 чэрвеня** струнны квінтэт «Серэнада» і салісты опернай трупы тэатра запрашаюць аматараў кіно ў тэатральную залу Нясвіжскага замка на канцэрт «З песняй па жыцці». Ён складзены з музычных твораў, без якіх сёння ўжо немагчыма ўявіць любімыя фільмы з «залатога фонду» савецкага кінематографа. А завершыць «Вечары...» гала-канцэрт пад адкрытым небам «Зоркі Вялікага ў Нясвіжы», дзе будуць прадстаўлены самыя вядомыя оперныя арыі, хары, куплеты і дуэты, нумары з класічных балетных пастановак, творы сусветнай музычнай спадчыны.

Паралельна з музычнай гасцям прапануюць і насычаную музейную праграму: у Вялікай выставачнай зале гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» адкрыецца экспазіцыя, прысвечаная антычнай культуры, а ў Малой зале можна будзе ўбачыць работы майстра-разьбяра па дрэве Аляксандра Свірыда.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

ДАРЭЧЫ

**18 чэрвеня апошні раз у гэтым сезоне беларуская публіка ўбачыць містычную драму «Макбет». Пасля спектакля тры вялізныя кантэйнеры з рэквізітам і дэкарацыямі адправяцца морам на гастролі — на Кіпр. Менавіта тут у канцы лета, з 30 жніўня да 1 верасня, на адкрытай пляцоўцы замка ў Пафасе будзе паказана гэта пастаноўка Міхаіла Панджавідзэ. Як расказалі «Звяздзе» ў Вялікім тэатры Беларусі, у гэтую далёкую паездку адпраўляецца досыць вялікі культурны дэсант — 165 чалавек, уключаючы не толькі салістаў, артыстаў хору і аркестр, але таксама пастановачную і тэхнічную групу.**



# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ОКТОБЕРФЕСТ И УДИВИТЕЛЬНАЯ ПРАГА»



**Общие положения**

Настоящие правила Рекламной игры «Октоберфест и удивительная Прага» (далее – Правила), целью проведения которой является стимулирование реализации товаров и (или) услуг (за исключением алкогольных/слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий), реализованных в ресторане «Раковский Бровар» по адресу: г. Минск, ул. Витебская, д. 10, разработаны в соответствии с Положением о проведении Рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения Рекламной игры «Октоберфест и удивительная Прага».

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

**Сайт, на котором содержится информация о Рекламной игре: www.brovar.by:** на данном сайте находятся Правила Рекламной игры «Октоберфест и удивительная Прага».

**1. Организатор Рекламной игры**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Раковский Бровар» (далее – Организатор), расположенное по адресу: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Раковская, д. 19а, пом. 2, каб. 20, УНП 101287377, ОКПО 37462793

**2. Участники Рекламной игры**

В Рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

Участником не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**3. Наименование игры** – Рекламная игра «Октоберфест и удивительная Прага»

**4. Территория проведения Рекламной игры** – ресторан «Раковский Бровар», находящийся по адресу: г. Минск, ул. Витебская, 10.

**5. Дата начала Рекламной игры:** 10.06.2019 г.

**6. Дата окончания Рекламной игры:** 02.09.2019 г.

**7. Наименования блюд и напитков, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра**

Блюда из основного меню, реализуемые в ресторане «Раковский Бровар» в период с 10.06.2019 г. по 20.08.2019 г. (за исключением алкогольных/слабоалкогольных напитков, пива, табачных изделий).

**8. Условия участия в Рекламной игре**

8.1 Для участия в Рекламной игре Участнику необходимо в период с 10.06.2019 года по 20.08.2019 года (включительно):

8.1.1 Приобрести блюда из основного меню Организатора Рекламной игры на сумму не менее 50 рублей в одном чеке (в стоимость не входят алкогольные/слабоалкогольные напитки, пиво, табачные изделия).

8.1.2 Получить за каждые 50 рублей в одном чеке Регистрационную анкету у администратора ресторана «Раковский Бровар».

8.1.3 Заполнить регистрационную анкету, указав Регистрационные (персональные) данные, а именно:

– персональные данные: фамилия, имя, отчество (если таковое имеется);

– почтовый адрес: почтовый индекс, область, район, населенный пункт, улица, дом, корпус, номер квартиры;

– номер мобильного телефона в международном формате.

8.1.4 Передать анкету сотруднику организатора или самостоятельно опустить Регистрационную анкету в Лототрон, установленный в ресторане «Раковский Бровар».

8.2 Общее количество Регистрационных анкет, помещенных в Лототрон одним участником, не ограничено при условии соблюдения правил всех подпунктов, указанных в п. 8.1 Правил.

8.3 В 00.00 часов 21.08.2019 г. прекращается приема (помещение) регистрационных анкет в Лототрон. Лототрон опечатывается печатью Организатора.

**9. Призовой фонд Рекламной игры. Состав и размер призового фонда и источники его формирования**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества Организатора в размере 3574, 00 ( три тысячи пятьсот семьдесят четыре) белорусских рубля 00 копеек.

9.1 Призовой фонд Рекламной игры включает следующий приз:

| № | Наименование приза | Определение приза | Кол-во | Стоимость с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Тур на двоих на «Октоберфест и удивительную Прагу» (далее – Приз) | Тур на двоих.<br>Страна: Чехия, Германия Отель: 4*<br>Заезд: 27.09.2019<br>Продолжительность: 4 дня/3 ночи<br>В поездку входит:<br>– перелет Минск – Прага – Минск – групповой трансфер аэропорт – отель – аэропорт – проживание в отеле 4* с завтраками – поездка на Октоберфест (обзорная по Мюнхену + самостоятельное время для посещения Октоберфеста)<br>Дополнительно оплачивается городской налог в отеле (около 0.3 евро в сутки), дополнительные экскурсии. В стоимость не включены визы и медицинские страховки | 1 | 3574, 00 |

**10. Место, дата, время, условия и порядок проведения розыгрыша призов**

10.1 **Розыгрыш Приза** проводится 25.08.2019 г. по адресу: г. Минск, ул. Витебская, 10, ресторан «Раковский Бровар». Время начала розыгрыша в 17:00.

**10.2 Механика проведения розыгрыша**

10.2.1 В розыгрыше Приза участвуют все регистрационные анкеты, заполненные участниками в период с 10 июня по 20 августа 2019 года в соответствиями с п. 8 настоящих Правил.

10.2.2 Снимается печать с Лототрона и в присутствии членов Комиссии анкеты, находящиеся в Лототроне, перемешиваются.

10.2.3 Обладатель приза определяется из числа участников Рекламной игры путем случайного извлечения членом Комиссии или приглашенным посторонним лицом из Лототрона Регистрационной анкеты участника Рекламной игры. Победитель получает тур на двоих на «Октоберфест и удивительную Прагу».

10.2.4. Результат розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе розыгрыша, подписанном присутствующими на заседании членами комиссии по проведению Рекламной игры.

**11. Порядок уведомления Победителей о результатах розыгрыша и порядок получения приза**

11.1 Победитель Рекламной игры извещается о выигрыше письменным уведомлением, высланным Организатором до 27.08.2019 г. на почтовый адрес, указанный Участником при заполнении Регистрационной анкеты.

Организатор также оставляет за собой право дополнительно уведомлять Победителей любым удобным ему способом: посредством СМС-рассылки, звонком по телефону на номер, указанный при регистрации данных на странице Рекламной игры.

11.2 Для получения приза победитель должен до 02.09.2019 (включительно) явиться по адресу: г. Минск, ул. Витебская, д. 10, предварительно связавшись с организатором по телефону +375447339339. Приз вручается по предъявлению победителем документа, удостоверяющего личность (паспорт гражданина Республики Беларусь или вид на жительство в Республике Беларусь). Для оформления необходимых документов для поездки победитель должен предоставить Организатору свои паспортные данные и паспортные данные второго человека, который отправится в туристическое путешествие.

11.3 Победитель самостоятельно, в случае необходимости, должен исчислить и произвести уплату подоходного налога.

11.4 В случае если Приз не получен в установленные Правилами Рекламной игры сроки либо с Победителем не удается связаться и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, Приз остается в распоряжении Организатора.

11.5 Приз считается переданным Победителю с момента подписания Победителем всех необходимых документов, предоставляемых Организатором.

11.6 Приз не подлежит замене. Выплата денежного эквивалента Приза не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче приза ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видом этого приза.

11.7 Организатор не оплачивает Победителю расходы, связанные с переездом к месту получения Приза, а также иные расходы и издержки Победителя и второго лица, понесенные ими в связи с поездкой в рамках полученного Приза и не включенные в стоимость Приза, указанную в п. 9.1 Правил.

11.8 В случае если Победитель не может получить Приз лично, Приз может получить его доверенное лицо при условии предъявления документа, удостоверяющего личность и нотариально удостоверенной доверенности.

**12. Комиссия по проведению Рекламной игры**

Для контроля за соблюдением официальных Правил Рекламной игры, проведения Розыгрыша, утверждением результатов Розыгрыша, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

1. Стебакова Елена Александровна – заведующая рестораном, ООО «Раковский Бровар»;

2. Миллер Анастасия Михайловна – администратор ресторана, ООО «Раковский Бровар»;

3. Шпак Ирина Николаевна – специалист по обучению, ООО «Табак-инвест»;

4. Кузьмич Елена Николаевна – старший кассир ресторана, ООО «Раковский Бровар»;

5. Видякина Лилия Сократовна – администратор ресторана, ООО «Раковский Бровар».

**13. Информация о Рекламной игре, публикация правил Рекламной игры**

13.1 Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

13.2 Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 29.08.2019 года включительно.

13.3 Информацию о Правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на интернет сайте www.brovar.by, а также по телефону +375447339339 с 12:00 до 24:00 ежедневно.

**14. Прочие условия**

14.1 Участие в Рекламной игре означает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя ответственности соблюдать все их условия и требования.

14.2 Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них будут использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель, выигравший Приз, дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

14.3. Участники Рекламной игры, претендующие на получение Приза, обязуются заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Рекламной игры для получения призов.

14.4. Организатор Рекламной игры не несет ответственность в случае невозможности осуществления победителем поездки ввиду отсутствия у него документов, необходимых для оформления поездки, а также за отказ посольства (консульства) в предоставлении визы по какой-либо причинам.

14.5 Организатор не несет ответственность за работу сети интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет Участнику), операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.) и почтовой службы (сроки доставки и т. д.).

14.6 Организатор не несет ответственность за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

14.7 Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры будут рассматриваться в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

14.8. Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору Рекламной игры по адресу: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Раковская, д. 19а, пом. 2, каб. 20.

*Свидетельство № 3568 о государственной регистрации Рекламной игры выдано 3 июня 2019 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь*

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ДАВАЙ-ДАВАЙ С НАМИ!»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Давай-Давай с нами!» (далее – Правила), направленной на повышение объемов безналичных расчетов с использованием банковских платежных карточек международной платежной системы «Visa», эмитированных ОАО «Банк Дабрабыт» в рамках банковского продукта «Давай-Давай» (далее – карточки Давай-Давай), разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Давай-Давай с нами!» (далее – Рекламная игра).

**1. Сведения об Организаторе.**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Агентство Маркетинговых Коммуникаций «РЭПКА», юридическое лицо согласно законодательству Республики Беларусь с местонахождением по адресу: г. Минск 220073, ул. Ольшевского, д. 20/11, оф. 21, УНП 191728827, зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом Республики Беларусь решением от 23 августа 2012 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей.

1.1. Заинтересованное лицо – ОАО «Банк Дабрабыт» (далее – Банк), 220002, г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1.

